


ЯК АТРЫМАЦЬ КРЭДЫТ НА ЖЫЛЛЁ 4

ТАЯМНІЦА НЕДАПІСАНЫХ КНІГ 19



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 КРАСАВІКА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 66 (29435)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Многія з пенсіянераў сёння ўносяць пасільны ўклад у развіццё эканомікі краіны. З 2,5 млн пенсіянераў 500 тысяч працуюць. Але яшчэ большая адказнасць ляжыць на вас у плане выхаваўчай функцыі. Цвёрдая грамадзянская пазіцыя, адказнасць, мудрасць робяць вас не толькі захавальнікамі найважнейшых традыцый, але і незаменнымі ўдзельнікамі далейшага дзяржаўнага будаўніцтва».*

# Ударнік малочнага цэха



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У адкрытым акцыянерным таварыстве «Свярдлоўскі» Жлобінскага раёна на малочнатаварных фермах працуюць некалькі мужчын-дояраў, і адзін з іх — Мікалай ГАПОНАЎ *(на фота)*, які па праве лічыцца адным з найлепшых спецыялістаў. Па-першае, Мікалай Вячаслававіч у сваёй справе трымае высокую планку прафесіянала і дасягае рэкордных надояў, а па-другое, ферма, дзе ён працуе, хоць і не сучасная, не абсталяваная па апошнім слове тэхнікі, але, тым не менш, здае малако экстра-класа, якое ідзе на прыгатаванне элітных сыроў і дзіцячага харчавання.

## КОРАТКА

- **Пошукавікі ў Беларусі знайшлі летась астанкі 878 байцоў.**
- Кабінет камп'ютарнай тамаграфіі адкрылі ў Калінкавіцкай ЦРБ.
- **З лясоў за I квартал вывезлі каля 450 кубаметраў смецця.**
- Беларускі сэрвіс на аснове нейрасеткі дазваляе выяўляць бессімптомную пнеўманію.
- **«Белавія» атрымала новы самалёт Boeing 737-8.**



- На падтрымку ветэранскіх арганізацый запланавана накіраваць да 2026 года больш за Br13 млн.
- **Вакцынаваным замежнікам з 8 красавіка дазволена наведваць сваякоў у Ізраілі.**

ISSN 1990 — 763X

На слыху

## УКОЛ НАДЗЕІ

### Прышчапіць ад каранавіруса плануецца 75 % насельніцтва

**Вакцынацыя ад каранавіруснай інфекцыі паступова пашыраецца і ахоплівае ўсё больш катэгорый насельніцтва. Хтосьці ўжо зрабіў прышчэпку, іншыя запісаліся на яе, некаторыя яшчэ разважаюць над гэтым. Але ўсё больш відавочным становіцца адно: вярнуцца да ранейшага жыцця і гэтак жа свабодна, як і ў даковідныя часы, наведваць кафэ і рэстараны, канцэрты і спаборніцтвы, пажылых сваякоў, нарэшце, падарожнічаць можна будзе, толькі маючы прышчэпку ад каранавіруса. Пра тэмпы вакцынацыі, паказанні і проціпаказанні, у тым ліку для людзей сталага веку, пра тое, як зрабіць прышчэпку ў сельскай мясцовасці і чаму менавіта да сельскіх жыхароў будзе асаблівая ўвага эпідэміёлагаў Мінскай вобласці, расказала намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына МІЛАНОВІЧ.**

***— Ірына Уладзіміраўна, раскажыце, якімі тэмпамі ідзе вакцынацыя ў Мінскай вобласці?***

— Вакцынацыя супраць каранавіруснай інфекцыі прадугледжвае ўвядзенне дзвюх доз вакцыны з інтэрвалам у тры-чатыры тыдні. Па стане на 7 красавіка першую прышчэпку зрабілі амаль 14 300 чалавек, у тым ліку больш за тры тысячы атрымалі ўжо дзве. У адпаведнасці з Нацыянальным планам мерапрыемстваў па вакцынацыі супраць COVID-19 на 2021—2022 гады, прадугледжана чатыры этапы. На першым прышчапляюцца медыцынскія і фармацэўтычныя работнікі, работнікі ўстаноў адукацыі і сацыяльнай сферы, асобы, якія пражываюць ва ўстановах з кругласутачным знаходжаннем. На наступным этапе падлягаюць вакцынацыі людзі, старэйшыя за 61 год, а таксама асобы, якія маюць хранічныя захворванні ці рызыку цяжкага цячэння каранавіруснай інфекцыі. На трэцім этапе будуць вакцынавацца людзі, у якіх па рабоце ёсць высокая рызыка заражэння: работнікі гандлю, сферы абслугоўвання, транспарту, камунальных службаў.

СТАР. 3

Кузня чэмпіёнаў

## ЧАВУСКІЯ СТАРТЫ

### Карэспандэнт «Звязды» паназірала за тым, як у невялікім райцэнтры рыхтуюць зорак біятлона



СТАР. 5

Збройнік Сяргей САПЕТАЎ выдае юным біятланістам спартыўную зброю.

З першых вуснаў

# «Нам трэба свае магчымасці, жаданні аб'яднаць і зрабіць некалькі крокаў да цеснага супрацоўніцтва»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з паслом Індыі Сангітай Бахадур. Нагодай стала завяршэнне яе дыпламатычнай місіі ў нашай краіне.**

Размову з кіраўніком Пасольства Індыі Прэзідэнт Беларусі пачаў з падзякі за работу, якую здзейсняла Сангіта Бахадур.

«Я паглядзеў: тавараабарот наш за 20 гадоў вырас у 10 разоў. Крыху больш за паўмільярда долараў — гэта годна, але недастаткова для нашых магчымасцяў. Мы можам больш, і вы гэта лепей мяне ведаеце», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў: ведае, наколькі дыпламат «акуратна адносіцца да Беларусі і жадае супрацоўнічаць далей з нашай краінай». «Мне б вельмі хацелася, каб чалавек, які прыедзе сюды пасля вас, прыехаў з такім жа жаданнем выбудаваць добрыя і плённыя адносіны з Беларуссю, каб ён прасунуў тыя задумы, якія былі ў вас у адносінах паміж Беларуссю і Індыяй. А пачынанняў нямала. Ды і зроблена нямала», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

Па словах кіраўніка краіны, за апошнія два дзесяцігоддзі бакі не толькі зразумелі, але і вывучылі магчымасці супрацоўніцтва. «Мабыць, настаў час, калі трэба заключаць канкрэтныя дагаворы і кантракты, ісці наперад у нашым супрацоўніцтве. Я мяркую, неабходны нейкі штуршок, стымул для таго, каб мы пачыналі практычна рэалізоўваць нашы задумы. Мяркую, добрым стымулам развіцця нашых адносін быў бы візіт Нарэндра Модзі (прэм'ер-міністр Індыі. — **«Зв.»**) у Беларусь», — лічыць Прэзідэнт.

Як ён дадаў, прэм'ер-міністр Індыі добра ведае, нават мае сяброўскія адносіны з ім. «Мне здаецца, яму трэба было б ужо пабываць у Беларусі. Яго афіцыйны візіт (мы яго прымем годна) стаў бы трыгерам у адносінах паміж нашымі краінамі ва ўсіх кірунках, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Мяркую, надышоў той час, калі нам трэба свае магчымасці і жаданні аб'яднаць і зрабіць некалькі крокаў да шчыльнага супрацоўніцтва».

Сангіта Бахадур адзначыла, што для яе вялікі гонар быць запрошанай на сустрэчу, бо ведае: не ўсе паслы ўдастойваюцца аўдыенцыі з Аляксандрам Лукашэнкам.

Пасол Індыі адзначыла, што падзяляе пазіцыю Прэзідэнта Беларусі па ўсіх аспектах і кірунках адносін, якія ён акрэсліў. «За тры гады маёй кадэнцыі тут мы значна нарасцілі гандаль. Беларусь павялічыла сваю прысутнасць у Індыі, і, як я ўжо заўважыла міністру (маецца на ўвазе кіраўнік МЗС Уладзімір Макей. — **«Зв.»**), неабходна актывізаваць супрацоўніцтва паміж прыватнымі сектарамі Беларусі і Індыі», — звярнула ўвагу Сангіта Бахадур.

Яна адзначыла, што дзякуючы яе садзейнічанню індыйскія кампаніі пачалі купляць самазвалы «БелАЗ», сельскагаспадарчая прадукцыя з нашай краіны знаходзіць належнае месца на рынку гэтай усходняй краіны, запатрабаваны ў Індыі і паслугі беларускіх IT-кампаній.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**• У тэму**

«Сёння мы працягваем развіваць нашы адносіны па ўсіх кірунках. У першую чаргу, гэта гандлёва-эканамічныя сувязі, палітычнае ўзаемадзеянне, працягваецца дыялог і кааперацыя на міжнародных пляцоўках», — заявіла журналістам па выніках аўдыенцыі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Індыі ў Беларусі Сангіта Бахадур.

Паводле яе слоў, значнае месца ў інтэнсіфікацыі сувязяў краін мае нябачная дыпламатыя па лініі пасольстваў.

«Мы ўжо зрабілі шмат. За маю кадэнцыю тут мы змаглі значна нарасціць наш гандлёвы абарот амаль да 50 працэнтаў. Канешне, на гэтым не трэба спыняцца. Наступным крокам можа стаць абмен візітамі высокага ўзроўню. Не трэба забываць, што сёння Індыя яшчэ перажывае наступствы пандэміі, таму не адбыліся высокапастаўленыя візіты, якія планаваліся ў мінулым годзе», — сказала дыпламат.

Сангіта Бахадур заўважыла, што дыялог на высокім узроўні можа працягнуцца сёлета або ў пачатку будучага года.

У цэнтры ўвагі

# АКЦЭНТ НА ЗАПАТРАБАВАНАСЦЬ

## Наталля Качанава і Васіль Герасімаў правялі нараду па пытаннях развіцця ААТ «Камволь»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА разам з кіраўніком Камітэта дзяржаўнага кантролю Васілём ГЕРАСІМАВЫМ наведалі Мінскі камвольны камбінат.**

Мэты сустрэчы з прадстаўнікамі кіраўніцтва і працоўнага калектыву аднаго з буйных беларускіх прадпрыемстваў лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці краіны і СНД Наталля Качанава патлумачыла неабходнасцю прааналізаваць на месцы ход выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы па ААТ «Камволь». А таксама паглядзець, як выконваецца бізнес-план па яго развіцці, абмеркаваць і знайсці шляхі ліквідацыі «вузкіх» месцаў, выпраўлення недахопаў і праблем, якія стаяць перад камбінатам. У прыватнасці, наколькі рацыянальна і з карысцю для эканомікі задзейнічаны свабодныя вытворчыя плошчы.

Таму Наталля Качанава адразу прапанавала гутарыць адкрыта і шчыра, без справаздач і рапартаў, а спыніцца на нявырашаных пытаннях. Спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла, што «мы прыехалі, каб разабрацца і падставіць плячо там, дзе ёсць магчымасць». Бо сёння стаіць задача не толькі выпускаць сучасную, прывабную і канкурэнтаздольную прадукцыю ў дастатковых аб'ёмах, але і па меры магчымасці наладзіць з тканін «Камволя» запатрабаваны ў краіне выпуск гатовых вырабаў: мужчынскае і жаночае адзенне, школьную форму і г. д. Для гэтага варта выкарыстоўваць усе магчымасці, адкрываць атэлье, фірмовыя крамы, шукаць іншыя формы рэалізацыі.

Як паведаміла журналістам **намеснік генеральнага дырэктара камбіната па камерцыйных пытаннях Юлія ГРЫНЧЫК,** па выніках мінулага года выраблена



Фота БелТА.

і рэалізавана прадукцыі амаль на 32 мільёны рублёў. Беларускія тканіны пастаўляюцца больш чым у 15 краін свету. Сярод асноўных традыцыйных рынкаў гэта ў першую чаргу Расійская Федэрацыя, а таксама Азербайджан, Казахстан, Арменія. Асаблівa перспектыўна выглядае ўзаемавыгаднае партнёрства. Асаблівa пасляхова гандаль ідзе за кошт расійскіх спажыўцоў. З імі наладжана ўзаемавыгаднае партнёрства. І невыпадкова ў першым квартале бягучага года рост паставак у Расію склаў 138 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Ёсць цікавасць да прадукцыі камвольнага камбіната і ў краінах Еўрапейскага саюза і Блізкага Усходу, Саудаўскай Аравіі, Пакістана, Эміратаў.

Так, пэўныя здабыткі ў калектыву «Камволя» ёсць, але гэтага недастаткова. Сёння трэба няўхільна павышаць эфектыўнасць вытворчасці, лічыць старшыня Савета Рэспублікі, бо пасля завяршэння ў 2017 годзе маштабнай мадэрнізацыі прадпрыемства ёсць усе шанцы спадзявацца на раскрыццё значнага патэнцыялу прадпрыемства на больш высокім узроўні.

Наталля Качанава агледзела вытворчасць камбіната, пазнаёмілася з яго прадукцыяй, выказала шэраг рэкамендацый і прапаноў.

За гады існавання «Камволь» прайшоў праз розныя выпрабаванні. Нагадаем: будаўніцтва Мінскага камвольнага камбіната пачалося 70 гадоў назад, яшчэ ў 1951 годзе. У 1955 годзе запушчана першая вытворчасць. У 1966—1976 гадах адбылася рэканструкцыя камбіната. Цяпер з дапамогай дзяржавы камбінат атрымлівае новае дыханне.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Ва ўрадзе

# АД КРАНАЎШЧЫКА ДА МІНІСТРА

## Прэм'ер-міністр уручыў медалі «За працоўныя заслугі» і аб'явіў Падзяку кіраўніка дзяржавы яшчэ 45 прадстаўнікам розных галін эканомікі краіны

**Цырымонія праходзіла ў Палацы Рэспублікі ў панядзелак: медалі, кветкі, шампанскае. Гэтым разам іншыя людзі, новыя імёны, але такія ж урачыстасць, хвалявання, словы падзякі ад кіраўніка ўрада.**

«Гэта вынік вашай адданасці сваёй справе, жыццёваму выбару, прафесійнаму прызнанню і роднай краіне, — звярнуўся да прысутных **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА.** — Сваім прыкладам вы даказалі, наколькі важныя прафесіяналізм і грамадзянская пазіцыя кожнага чалавека ў развіцці рэспублікі».

Стаўленне да працы ўзнагароджаных — яркі арыенцір для маладога пакалення на тое, як можна і трэба рэалізаваць сябе, лічыць прэм'ер.

Гэтым разам асноўная колькасць дзяржаўных узнагарод была ўручана работнікам сельскай гаспадаркі: галоўным аграномам, жывёлаводам, трактарыстам, заатэхнікам.

«У Беларусі ствараюцца ўсе ўмовы для развіцця аграпрамысловага комплексу, — заявіў Раман Галоўчанка. — Надзейна забяспечана вашай працай харчовая бяспека нашай краіны, а экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі — адзін з кірункаў, які найбольш расце і дае валютную выручку краіне».

Асабліва падзякаваў прэм'ер-міністр і прысутным работнікам прамысловасці, сярод якіх былі кранаўшчык, матальшчыца і прадзільшчыцы.

Раман Галоўчанка заўважыў, што, нягледзячы на крайне складаны мінулы год для машынабудаўнікоў, прыборабудаўнікоў усяго свету, у тым ліку і Беларусі, усе канвееры краіны працавалі, кантракты і абавязкі выконваліся.

«Год мінулы быў скончаны на пад'ёме, і гэты пад'ём працягваецца сёлета, — дадаў ён. — Усе абавязкі, якія прамысловцы прынялі на сябе ў першым квартале, выкананы. Гэта вельмі добры вынік».

Прэм'ер адзначыў і важную ролю менеджменту ў дасягненні пастаўленых задач. Сярод узнагароджаных шмат кіраўнікоў розных узроўняў: ад начальнікаў малочна-таварных ферм да міністра прамысловасці.

Кіраўнік урада падзякаваў усім і заклікаў не спыняцца на дасягнутым, дабівацца новых мэт на карысць развіцця Беларусі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМ У СУБОТУ ПРАЦУЕ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 10 красавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валерый Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

• кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'яна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# УКОЛ НАДЗЕІ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Усе ахвотныя вакцынуюцца на чацвёртым этапе, калі з'явіцца дастатковая колькасць вакцыны. Мяркуецца, што яна будзе вырабляцца айчынным прадпрыемствам «Белмедпрэпараты». Стаіць задача прышчапіць не менш за 75 % насельніцтва: згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, менавіта столькі патрэбна для стварэння калектыўнага імунітэту.

Цяпер ідзе другі этап. У арганізацыях аховы здароўя на сваіх участках ведаюць пажылых пацыентаў і людзей з хранічнымі хваробамі, іх паступова запрашаюць на прышчэпкі. Таксама вядзецца запіс усіх ахвотных, хто жадае прышчапіцца.

***— Вы сказалі пра людзей, старэйшых за 60 гадоў, якіх вакцынуюць цяпер. А ці могуць прышчапляцца людзі, старэйшыя за 80 ці 90 гадоў?***

— Так, бо ўзроставага абмежавання для пажылых людзей няма. Катэгорыю старэйшых за 60 гадоў вылучылі асобна, бо, як правіла, у гэтых людзей ёсць хранічныя захворванні, камарбідныя паталогіі, у іх замаруджаны абменныя працэсы, і больш рызыкі, што каранавірусная інфекцыя будзе працякаць у цяжкай форме.

***— Для прышчэпкі трэба абавязкова прыйсці ў паліклініку, паколькі вакцына патрабуе нізкіх тэмператур?***

— Мяркую, што ў арганізацыях аховы здароўя будзе прадуманы алгарытм, які падыдзе для людзей сталага веку. У Еўропе прышчапляюць нават у гандлёвых цэнтрах. Так, расійская вакцына «Спадарожнік V» патрабуе тэмпературы мінус 18, а вось умовы захавання кітайскай вакцыны Vero Cell, якую ў нас таксама выкарыстоўваюць, — як і ў іншых імунабіялагічных прэпаратаў: ёй не патрэбны такія нізкія тэмпературы.

***— Якая сітуацыя з вакцынай у раёнах Мінскай вобласці? Як можна запісацца на прышчэпку жыхарам райцэнтра ці сельскай мясцовасці?***

— Вакцына супраць каранавіруснай інфекцыі маецца ў арганізацыях аховы здароўя ўсіх адміністрацыйных тэрыторый Мінскай вобласці. Запісацца можа любы ахвотны ва ўзросце старэй за 18 гадоў у амбулаторна-паліклінічнай арганізацыі па месцы жыхарства. Там жа неабходна ўдакладніць, дзе і калі можна зрабіць прышчэпку.

***— Мяркуецца, што ў сельскую мясцовасць Мінскай вобласці разам з урачамі цяпер будуць выязджаць эпідэміёлагі...***

— Яны будуць працаваць не толькі з выязнымі фельчарска-акушэрскімі пунктамі, але і самастойна ў планавым парадку выязджаць у сельскую мясцовасць. Мы прымеркавалі гэту работу да Сусветнага дня здароўя, які сёлета праходзіць пад дэвізам даступнасці медыцынскай дапамогі шырокім слаям насельніцтва. Вакцынацыя — адзін з відаў прафілактычнай дапамогі, якая таксама павінна быць шырока даступная. На сённяшні дзень важна данесці да людзей, наколькі неабходна рабіць прышчэпкі, якую ахову яны даюць непасрэдна таму, хто прышчапіўся, яго сям'і, блізкім, што азначае калектыўны імунітэт, калі людзі вакол цябе прышчэплены і не могуць быць крыніцай заражэння. У сельскіх рэгіёнах даступнасць інфармацыі меншая. Там пражываюць пераважна пажылыя людзі, не ўсе з іх могуць карыстацца сучаснымі сродкамі сувязі і інтэрнэтам. Нашы спецыялісты раскажуць, якая вакцына выкарыстоўваецца, пра яе перавагі, пакажанні і проціпаказанні, адкажуць на пытанні.

***— Якія проціпаказанні ў прышчэпкі ад COVID-19?***

— Гэта ўзрост да 18 гадоў, цяжарнасць і грудное кармленне, гіперадчувальнасць да якога-небудзь кампанента вакцыны, цяжкія алергічныя рэакцыі ў анамнезе. Вострыя інфекцыйныя захворванні і абвастрэнні хранічных хвароб з'яўляюцца часовымі проціпаказаннямі. Прышчэпку можна зрабіць праз 2—4 тыдні пасля выздараўлення ці рэмісіі.

***— Ці трэба рыхтавацца да прышчэпкі?***

— Па вялікім рахунку, так. Трэба ведаць і ўсведамляць, што апошнія 14 дзён у вас не павінна быць вострых рэспіраторных захворванняў і абвастрэння хранічных хвароб, у гэты час вы не кантактавалі з людзьмі, якія хварэюць на каранавірусную інфекцыю. Урач перад прышчэпкай вымярае тэмпературу, утрыманне кіслароду ў крыві, робіць агульны агляд, каб зразумець, ці дазваляе стан чалавека рабіць прышчэпку.

***— Якія пабочныя рэакцыі могуць быць пасля прышчэпкі і як з імі спраўляцца?***

— Пасля прышчэпкі можа назірацца грыпападобны сіндром: павышэнне тэмпературы (часам да 38-39 градусаў), мышачныя і суставныя болі, слабасць, галаўны боль. Пры неабходнасці рэкамендуецца прымаць гарачкапаніжальныя сродкі. Звычайна сімптомы праходзяць цягам 1-2 дзён. Калі высокая тэмпература трымаецца больш за суткі, варта звярнуцца да ўрача. Радзей адзначаюцца млоснасць, дыспепсія, зніжэнне апетыту, часам назіраецца павелічэнне рэгіянальных лімфавузлоў.

Маніторынг развіцця пабочных рэакцый пасля зробленых прафілактычных прышчэпак у Мінскай вобласці паказаў, што як на першую, так і на другую агульныя рэакцыі развіваліся ў 2,2 % прышчэпленых, мясцовыя рэакцыі — у 1,2 % прышчэпленых пасля першай прышчэпкі і ў 0,9 % прышчэпленых — пасля другой прышчэпкі. Пабочная рэакцыя можа развівацца на любую прышчэпку, і гэта нармальна. Яе наяўнасць (як мясцовай, так і агульнай) сведчыць пра імунны адказ арганізма на вакцыну. Дарэчы, я і сама зрабіла прышчэпку.

***— Ці можна заразіцца каранавірусам пасля прышчэпкі?***

— Прышчэпка не гарантуе на 100 %, што вы не заразіцеся каранавіруснай інфекцыяй. Узровень імуннага адказу ў кожнага чалавека свой. Але адназначна можна сказаць, што ў вакцынаваных рызыка захварэць у разы ніжэйшая, чым у тых, хто прышчэпкі не рабіў. Галоўная задача вакцынацыі — засцерагчы ад цяжкай формы хваробы і смяротна небяспечных ускладненняў. Фарміраванне калектыўнага імунітэту, у першую чаргу поствакцынальнага, дапаможа спыніць эпідэмію.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

## У нядзелю будзе ўжо да 20 цяпла

**Ну, безупынны халадзільнік. Менавіта так варта называць надвор'е на гэтым тыдні. А яно было сапраўды халодным — недзе на 2—4 градусы ніжэй за кліматычную норму. Але ў выхадныя сітуацыя ў атмасферы зменіцца. Паветраная маса пачне паступаць з паўднёвага захаду Еўропы, і пацяплее, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу будзе воблачна з праясненнямі, удзень месцамі па паўночным захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер удзень парывісты, у асобных раёнах па паўночным захадзе краіны моцны парывісты. Уначы складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла. Удзень — ад плюс 9 градусаў да 16 цяпла. У нядзелю пераменная воблачнасць, месцамі па паўночным захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднёвы ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—6 градусаў, а ў дзённыя гадзіны — да 14—20 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у першай палове наступнага тыдня захаваецца цёплае надвор'е з максімальнымі тэмпературамі каля 20 градусаў цяпла. У панядзелак — без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў. Удзень будзе ад плюс 13 градусаў да 20 цяпла. У аўторак месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 2—9 градусаў. Удзень будзе плюс 11—18 градусаў, а па поўдні краіны — аж да 20 цяпла.

Электратранспарт

## У сталіцы ўстанаўліваюць зарадныя комплексы, якім няма аналагаў у СНД

Дарэчы, з часам навінка «прапішацца» і ў рэгіёнах

**А на дадзеным этапе 18 комплексаў па шэсць зарадных станцый у кожным устанаўлівае ў Мінску сетка ЭЗС Malanka. Кожная станцыя мае магутнасць 50 кВт, што дазваляе ўладальнікам электракараў папаўняць зарад на 30-40 кіламетраў усяго за 10 хвілін. Такія комплексы — ноу-хау беларускіх распрацоўшчыкаў.**

Як вядома, на сакавік бягучага года ў Беларусі налічвалася больш за 2500 электрамабіляў. Папулярнасць экалагічнага транспарту працягвае расці. Па прагнозах спецыялістаў, сёлета іх колькасць павялічыцца ў тры разы — і перавысіць адзнаку ў 7500 штук.

Для таго каб кіроўцы электрамабіляў мелі магчымасць зараджацца хутка і зручна, гэтая сетка ЭЗС устанаўлівае новыя зарадныя комплексы, а таксама скарачае адлегласць паміж станцыямі. У студзені бягучага года Malanka ў Мінску пераадолела мяжу ў 300 станцый, да канца года ў сталіцы, на якую прыпадае львіная доля электрапарку краіны, з'явіцца яшчэ больш за 60 станцый. Сярод іх — электразарадныя комплексы на шэсць зарадных станцый.

**У хуткім часе такія комплексы з'явяцца на вуліцах Камсамольскай, 34; Жыновіча, 7; Мірашнічэнкі, 3; праспекце Газеты «Звязда», 16.**

Электразарадных комплексаў, дзе адначасова на «хуткіх» станцыях можа зараджацца шэсць электрамабіляў, няма ў ніводнай з краін СНД. Так, ва Украіне нядаўна прэзэнтавалі самы вялікі зарадны комплекс, які складаецца з чатырох зарадных станцый.

«Кожная станцыя на электразарадным комплексе мае магутнасць 50 кВт, што дазваляе зараджацца хутка. Мы ўстанаўліваем іх паблізу гандлёвых і адміністрацыйных цэнтраў, а таксама недалёка ад МКАД. Выбар месца ўстаноўкі невыпадковы. Электразарадныя комплексы дазваляюць аднachасова зараджаць некалькі электрамабіляў у месцах, дзе гэта неабходна», — кажа **намеснік дырэктара ВА «Беларуснафта» Андрэй КОЦІК.**

Сёлета першыя зарадныя комплексы да шасці зарадных станцый з'явяцца ва ўсіх абласных гарадах краіны, а адлегласць паміж суседнімі ЭЗС на трасах Malanka плануе скараціць да 80 км. Цяпер адлегласць паміж станцыямі складае 100—150 кіламетраў. У 2021 годзе кампаній Malanka распрацаваны план, згодна з якім на вядучых магістралях краіны будуць устаноўлены дадатковыя зарадныя слупкі. У Лагойскім, Барысаўскім, Лунінецкім раёнах, у раёне населенага пункта Краснае (Гомельская вобласць) з'явяцца зарадныя станцыі магутнасцю ад 150 да 180 кВт, здольныя цалкам зарадзіць батарэю электратранспарту за паўгадзіны.

«У 2022 годзе мы плануем запускаць пілотны комплекс з суперхуткай зарадкай, магутнасць адной станцыі — да 350 кВт, што дазволіць зарадзіць электрамабіль за дзесяць хвілін на 340 кіламетраў. Новыя зарадныя комплексы стануць свайго роду АЗС для электрамабіляў, паколькі час зарадкі на такіх комплексах будзе супастаўны з часам запраўкі аўтамабіляў бензінам. А з развіццём электратранспарту гэты час будзе яшчэ змяншацца», — падзяліўся планамі Андрэй Коцік.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Падчас пагромаў у Белфасце пацярпелі дзясяткі чалавек



У сталіцы Паўночнай Ірландыі Белфасце ўжо некалькі начэй не сціхаюць беспарадкі, паведаміла The Washington Post. Па версіі сіл бяспекі, да пагромаў датычныя схільныя да гвалту групоўкі, лаяльныя да пратэстанцкай суполкі і замяшаныя ў гандлі наркотыкамі. Верагодная падстава паслужыла рашэнне пракуратуры не прыцягваць да адказнасці шэраг высокапастаўленых палітыкаў з каталіцкай праірландскай партыі Sinn Fein, якія ва ўмовах каранавірусных абмежаванняў наведалі пахаванне колішняга ўдзельніка Ірландскай рэспубліканскай арміі, які змагаўся за аддзяленне рэгіёна ад Злучанага Каралеўства. Акрамя таго, частка пратэстанцкай абшчыны незадаволена асаблівым статусам Паўночнай Ірландыі пасля выхаду Вялікабрытаніі са складу Еўрасаюза. Падчас беспарадкаў пацярпела больш за 40 паліцэйскіх. Па звестках улад, было здзейснена нападзенне на фатографа. Пагромшчыкі спалілі рэйсавы аўтобус. Паліцыя заклікала жыхароў устрымацца ад наведвання некалькіх раёнаў Белфаста.

### МВФ падтрымаў ідэю аб увядзенні часовага «падатку для багатых»

Міжнародны валютны фонд падтрымаў ідэю прэзідэнта ЗША Джо Байдэна аб увядзенні часовай адзінай мінімальнай стаўкі карпаратыўнага падатку ва ўсім свеце, паведаміла Euronews. У арганізацыі заяўляюць, што кампаніі і забяспечаныя людзі, якія павялічылі капітал падчас пандэміі, могуць плаціць больш. У фондзе заклікаюць умацоўваць міжнароднае супрацоўніцтва з мэтай вытворчасці і распаўсюджвання вакцын ва ўсіх краінах. «Калі прагрэс у пытаннях вакцынацыі паскорыцца і вакцыны будуць даступны кожнаму, то фінансавыя, сацыяльныя і эканамічныя перавагі будуць велізарнымі. Вакцынацыя можа стаць самым выгадным укладаннем сродкаў у глабальны праект дзяржаўнага сектара», — заявіў дырэктар Дэпартамента бюджэтных пытанняў МВФ Вітор Гаспар. Між тым агульны суверэнны дзяржаўны доўг усіх краін набліжаецца да 100 % сусветнага ВУП. Міністры эканомікі і фінансаў і кіраўнікі цэнтрабанкаў краін G20 абвясцілі пашырэнне рэзерваў МВФ на 650 мільярдаў долараў у надзеі, што гэта дапаможа аднаўленню сусветнай эканомікі.

### Кітай пачне будаўніцтва пятага касмадрома

Пяты касмадром будзе пабудаваны ў павеце Сяншань усходняй кітайскай правінцыі Чжэцзян. Аб гэтым паведамляецца на сайце правінцыйнай зоны свабоднага гандлю Нінбо. Тэндар на будаўніцтва стартавай пляцоўкі касмадрома, у які будуць уваходзіць камандны цэнтр і зборачна-выпрабавальны комплекс, выйграла інжынерная кампанія правінцыі. У рамках інфраструктурных планаў урада Чжэцзян на 2021—2025 гады Нінбо інвесціруе ў праект 20 мільярдаў юаняў ($3 млрд). Мяркуецца, што касмадром будзе здольны ажыццяўляць да 100 запускаў ракет у год. Паводле даных СМІ, Сяншань мае спрыяльную шырату для запуску ракет, параўнальную з мысам Канаверал, дзе знаходзіцца Касмічны цэнтр Кенэдзі (Фларыда, ЗША). Зараз у Кітаі чатыры касмадромы — тры на мацерыковай частцы і яшчэ адзін — на паўднёвым востраве Хайнань.

По палічках

# «ХАЧУ КРЭДЫТ!»




### Хто, на што і на якіх умовах яго сёння можа атрымаць

**З першых дзён лютага Беларусбанк аднавіў крэдытаванне куплі кватэр на другасным рынку жылля і ва ўжо здадзеных новабудоўлях. У той час працэнтная стаўка па ім была занадта высокая, нядаўна яе падкарэкціравалі і цяпер яна складае 20 % гадавых. На мой погляд, гэта занадта дорага. Прыкладна 15 гадоў таму я браў крэдыт на жыллё пад 13 % гадавых. Тады гэтыя лічбы мне здаваліся завоблачнымі. Цяпер я даплачваю той крэдыт, а штомесячны (аднолькавы) плацеж складае ўсяго 17 рублёў. Так што паспрабуем разабрацца — ці сапраўды гэта дорага, і якія ёсць нюансы.**

## На 6 % больш, чым год таму

Спачатку разбяромся з плюсамі гэтага банкаўскага прадукту. Крэдыт называецца «Іпатэка Экспрэс» на набыццё жылога памяшкання. Выдаецца ён на тэрмін да 20 гадоў і працэнтная стаўка цяпер складае 20 % гадавых. Сярод пераваг, агучаных фінансавым інстытутам, з'яўляецца хуткае прыняцце рашэння. Сапраўды, з часу падачы заяўкі на крэдыт да прыняцця банкам рашэння праходзіць не больш як адзін рабочы дзень. Асноўныя ўмовы выдзялення крэдыту выглядаюць такім чынам.

Крэдыт даецца на тэрмін да некалькіх дзясяткаў гадоў і толькі пад заклад набываемай кватэры, што па ўмовах падобна да класічнай іпатэкі. Сума крэдыту можа дасягаць да 100 % кошту набыцця жылога памяшкання, у межах плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка, але...

Першапачаткова пры вызначэнні магчымай сумы крэдыту ўлічвалася толькі велічыня даходаў самога крэдытаатрымальніка, без магчымасці ўключаць даходы блізкіх сваякоў у сукупны даход. Эксперты банка ўбачылі, што дадзены аспект у значнай меры насцярожвае патэнцыйных кліентаў, і выправілі гэты пункт умоў.

Цяпер пры разліку агульнай сумы крэдыту магчымае ўключэнне ў сукупны даход крэдытаатрымальніка даходаў паручыцеляў — блізкіх сваякоў членаў сям'і кліента (мужа, жонкі, бацькоў, дзяцей, родных братоў і сясцёр мужа і жонкі, унукаў).

Да мінусаў варта аднесці тое, што рэальная стаўка крэдытавання павялічылася ў параўнанні з 2020 годам адразу на 6 %. А калі быць дакладнымі, стаўка па крэдыце фарміруецца па наступнай формуле: стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка Беларусі, павялічаная на 12,25 працэнтнага пункта. Памер стаўкі рэфінансавання ў Беларусі па стане на красавік 2021 года складае 7,75 %.

Прааналізаваўшы вышэйпрыведзеныя ўмовы, можна прыйсці да высновы, што ў параўнанні з мінулым годам умовы атрымання крэдыту на куплю кватэры на другасным рынку ўскладніліся. Фактычна так яно і ёсць: для кагосьці стане «непад'ёмнай» павялічаная стаўка крэдытавання, а хтосьці не зможа ўзяць патрэбную суму ў крэдыт з прычыны абмежаваных даходаў.

## Затое паручыцелі непатрэбныя

У новай праграмы крэдытавання ёсць і сапраўды добрыя бакі. Па даных сектара іпатэчнага крэдытавання сталічнага агенцтва нерухомасці, другой па значнасці праблемай крэдытаатрымальнікаў выступае неабходнасць пошуку паручыцеляў. Трэба было шукаць такіх людзей, якія пагодзяцца ўзяць на сябе абавязацельствы па выплаце вашага крэдыту ў выпадку, калі вы самі з якіх-небудзь прычын гэтага зрабіць не зможаце. Далёка не кожны пагодзіцца ўзяць на сябе такую адказнасць. А як паказвае практыка, нават калі людзі згаджаюцца, то не заўсёды яны могуць падысці ў якасці паручыцеляў (па даходзе, узросце і гэтак далей).

Цяпер, па новых умовах крэдытавання, паручыцелі не патрабуюцца — таму што залогам забеспячэння крэдытных абавязацельстваў будзе выступаць сама кватэра. Менавіта гэтым і абумоўліваецца абмежаванне па будаўнічай гатоўнасці кватэр, на набыццё якіх можна ўзяць крэдыт, — яны ўсе павінны быць ужо ўведзеныя ў эксплуатацыю. Бо менавіта ў гэтым выпадку яны будуць выступаць у якасці гатовага аб'екта нерухомасці, які можна ўзяць у заклад крэдыту. І менавіта таму не дапускаецца ўзяцце крэдыту на куплю часткі (долі) кватэры — можна толькі на ўсё жылое памяшканне цалкам.

## Узрост мае значэнне

Для набыцця іпатэчнага крэдыту падрыхтаваны своеасаблівыя патрабаванні да заяўнікаў. Па-першае, крэдыты выдаюцца дзеяздольным фізічным асобам (грамадзянам нашай краіны і замежным грамадзянам (асобам без грамадзянства), якія пастаянна пражываюць і маюць пастаянную крыніцу даходу ў Беларусі.

Ёсць некалькі нюансаў, што датычацца пажылых людзей. Кліентам банка, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, крэдыты выдзяляюцца (пры прад'яўленні ў забеспячэнне выканання абавязацельстваў па крэдыце паручальніцтваў фізічных асоб з ліку членаў сям'і, блізкіх сваякоў, якія не дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту) зыходзячы з памеру пенсіі або пры ажыццяўленні працоўнай дзейнасці — зыходзячы з памеру сярэднямесячнага даходу ад працоўнай дзейнасці за апошнія тры месяцы.

Калі казаць коратка і зразумела, то якраз у гэтым выпадку пенсіянерам проста неабходныя яшчэ і паручыцелі з ліку блізкіх сваякоў. А без іх ніяк.

## Не купіць кватэру, а памяняць

Улічваючы нашы невялікія даходы, задаешся слушным пытаннем, а на каго разлічана гэтае іпатэчнае крэдытаванне? Аналітыкі адзначаюць, што кліенты праграмы ўжо знайшліся. Гэта тыя, каму патрэбна невялікая сума эквівалентам да 14 тысяч долараў. У гэтым выпадку сярэднямесячны даход крэдытаатрымальніка (пасля выплаты падаткаў і гэтак далей) павінен складаць каля 1250 рублёў.

У рэальнасці гэта занадта малая сума, каб купіць кватэру, лічаць эксперты. Але справа ў тым, што цяпер большасць кватэр купляецца наўзамен сваіх «старых» — напрыклад, у мэтах пашырэння жылплошчы (колькасці пакояў) або пераезду ў новабудоўлю. У падобных выпадках пакупнікам патрэбна не ўся сума, а толькі даплата да цаны прадаванай кватэры. І таму названай вышэй сумы крэдыту цалкам дастаткова для даплаты.

На сайце Беларусбанка ў графе «Іпатэка» ёсць паслуга «Калькулятар», якая ў аўтаматычным рэжыме разлічвае максімальны памер крэдыту пры зададзенай зарплаце. Я ўнёс туды прыкладны заробак (1 тысячу рублёў), іншыя даныя і атрымаў, што максімальны памер крэдыту ў мяне складае 32 804,55 рубля. А памеры штомесячнага плацяжу складуць 684 рублі. Працэнты за ўвесь перыяд карыстання крэдытам будуць удвая большыя, чым тая сума, якую я хачу ўзяць, — 70 529,78 рубля.

Атрымліваецца, што пры ўмове заробку ў 1000 рублёў максімальны крэдыт (паводле атрыманых даходаў) будзе складаць прыкладна 12 340 долараў. Мабыць, цалкам хопіць для пераезду з маёй двухпакаёвай кватэры ў больш прасторную трохпакаёвую. Толькі ці вартая новая кватэра такіх ахвяр?

## Успомнілі пра сістэму будзберажэнняў

На думку аналітыкаў другаснага рынку нерухомасці, крэдыты на такіх умовах наўрад ці істотна ускалыхнуць актыўнасць патэнцыйных пакупнікоў, як гэта было ў 2017—2020 гадах.

У выніку сёлета доля пакупнікоў кватэр другаснага рынку з крэдытамі будзе на ўзроўні не большым за 6 %, у той час як сярэдні паказчык за 2020 год быў на ўзроўні 22 %, а за 2019 год — прыблізна 27 %. Пры гэтым у апошнім квартале мінулага года крэдыты на другасным рынку былі даступныя толькі па сістэме будзберажэнняў, калі для атрымання крэдыту спачатку неабходна было размясціць уклад у рамках сістэмы будаўнічых зберажэнняў Беларусбанка, а ўжо па заканчэнні ашчаднага этапу (не меншага за 19 месяцаў) можна было прэтэндаваць на атрыманне крэдыту. Менавіта таму доля пакупнікоў з крэдытам у канцы мінулага года была такой нязначнай.

Аднаўленне крэдытавання — гэта добра. Але высокія стаўкі і патрабаванні да даходу крэдытаатрымальнікаў значным чынам абмяжоўваюць даступнасць крэдытавання шырокаму колу пакупнікоў. А значыць, пакупніцкая актыўнасць на другасным рынку таго ж Мінска па-ранейшаму застанецца слабай, бо магчымасцяў купіць кватэру будзе па-ранейшаму няшмат.

## Спажывецкі крэдыт можна ўзяць за гадзіну, вось толькі працэнты «кусаюцца»

Такіх крэдытаў цяпер мноства. Аўтакрэдыт, крэдыт на адпачынак, на халадзільнік, на пральную машыну, на мэблю, на ўсё, што пажадаеш. Мне на вочы трапіўся спажывецкі крэдыт «На асабістае» ад аднаго камерцыйнага банка. Ён выдаецца літаральна за гадзіну. Патрэбныя толькі пашпарт і даведка з работы. У дадзеным банку вам дадуць крэдыт да 10 тысяч рублёў без паручыцеляў. Праўда, працэнты за карыстанне такімі грашыма немаленькія — 24,99 %.

У жыцці ўсякае здараецца. Мае суседзі па пад'ездзе задумалі рамонт. Для поўнага шчасця не хапала пяці тысяч рублёў. Пайшлі ў найбліжэйшы банк. Дык вось, мінімальны тэрмін крэдыту «На асабістае» 6 месяцаў, з мінімальнай пераплатай 628 рублёў. Плаціць прыйдзецца ў месяц 938 рублёў, а значыць, даход сям'і павінен быць значна большы. Не атрымліваецца.

Можна ўзяць такі крэдыт на два гады і плаціць у месяц ужо толькі 321 рубель. Але ў гэтым выпадку агульная сума пераплат банку складзе 2 тысячы 705 рублёў. Вы хочаце дарыць такія грошы банку? Нездарма ж пра крэдыты кажуць: «Бярэш чужыя, аддаеш свае». Ды яшчэ і ў большым памеры.

**Сяргей КУРКАЧ.**


ТЕХНОБАНК

ОАО «Технобанк»
220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.
Телефон +375 17 283 15 10

Форма 1

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2021 года**

**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2021 год | 2020 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3.1 | 90 434 | 76 216 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 3.2 | 458 | 571 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 3.3 | 69 083 | 67 979 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 3.4 | 39 529 | 42 576 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3.5 | 56 355 | 47 143 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 3.6 | 372 510 | 383 303 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 583 | 410 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 3.7 | 2 | 2 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 3.8 | 24 091 | 24 086 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 3.9 | 1 750 | 1 762 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 3.10 | 3 194 | 2 940 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 3.11 | 38 | 65 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 3.12 | 5 295 | 5 364 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **663 322** | **652 417** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 3.13 | 4 064 | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 3.14 | 7 869 | 8 629 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 3.15 | 520 616 | 516 596 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 3.16 | 32 356 | 32 091 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 36 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 3.17 | 10 317 | 12 072 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **575 222** | **569 424** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 3.18 | 11 463 | 11 463 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 9 039 | 8 506 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 3.19 | 17 484 | 17 131 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 3.20 | 50 114 | 45 893 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **88 100** | **82 993** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **663 322** | **652 417** |

Форма 2

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2021 г.**

**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2021 год | 2020 год |
|---|---|---|---|---|---|
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 9 506 | 8 069 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 3 806 | 3 219 |
| **3** | **Чистые процентные доходы** | **201** | **4.1** | **5 700** | **4 850** |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 9 880 | 7 278 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 5 218 | 3 506 |
| **6** | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | **4.2** | **4 662** | **3 772** |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 4.3 | 16 | 110 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 4.4 | (178) | 10 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 4.5 | 6 101 | 9 009 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 4.6 | 172 | (44) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4.7 | 322 | 4 214 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 4.8 | 584 | 1 607 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 4.9 | 10 185 | 10 322 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4.10 | 563 | 572 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 5 987 | 4 206 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 1 240 | 882 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **4 747** | **3 324** |

**Председатель Правления** **Д.Ю.Грузицкий**

**И.о. главного бухгалтера** **М.Д.Давидович**

**Дата подписания: 05 апреля 2021 г.**

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта:
**https://tb.by/about/bank/finance/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.12.2013 г.
УНП 100706562

# ЧАВУСКІЯ СТАРТЫ

**«Па якасці гэты спартыўны аб'ект стане другім пасля Раўбіч. З часам мы зможам праводзіць тут спаборніцтвы рэспубліканскага і нават міжнароднага ўзроўню», — паабяцаў міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук на адкрыцці біятлоннай базы ў Чавусах у жніўні мінулага года. Яна пабудавана пры раённай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву, якая лічыцца ў краіне адной з наймацнейшых па падрыхтоўцы біятланістаў. Адна з выхаванак гэтай школы — маладая зорка беларускага біятлона Дзінара Алімбекава. Не так даўно яна стала пераможцай этапу Кубка свету ў аўстрыйскім Хохфільцэне ў спрынце і сярэбраным прызёрам у гонцы пераследу. Тут, у Чавусах, стартавалі ў вялікі спорт сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў у Ванкуверы Сяргей Новікаў, а таксама член нацыянальнай зборнай Рэспублікі Беларусь, удзельнік Алімпійскіх гульняў, чэмпіён Еўропы Раман Ялётнаў.**


Алег САМСОНАЎ: «А гэта наша Дзінара».

## Два ў адным

Мясціны тут шыкоўныя. Калісьці на гэтым месцы размяшчалася сядзіба графаў Талстых. Ад былой рэзідэнцыі засталіся некалькі ліп і рэшткі цаглянай клеці. Зараз месца на ўзвышшы над ракой Басяй займае Чавуская абласная школа са сваімі адміністрацыйнымі, жылымі, спартыўнымі, гаспадарчымі пабудовамі і нават сваёй кацельнай і лазнева-пральным комплексам. Лічы, аўтаномны спартыўны гарадок. Тут будучыя спартсмены і жывуць, і вучацца. Гэта адзіная агульнаадукацыйная школа ў краіне са спартыўнымі класамі па біятлоне і цяжкай атлетыцы. Узначальвае яе **Алег САМСОНАЎ, ураджэнец Чавус і біятланіст** (у 1990-я, калі пачаў займацца гэтым відам спорту, у райцэнтры ім захаплялася ўся моладзь). Дарэчы, працуе ён тут роўна 20 гадоў, апошнія восем — у якасці дырэктара. У агульнаадукацыйную са спецыялізаванымі спартыўнымі класамі ўстанова была рэарганізаваная ў 2014-м. Адпаведна, рэжым дня і заняткаў тут складзены з такім разлікам, каб дзеці маглі больш часу аддаваць трэніроўкам. У 8.20 — пачатак заняткаў, з 10.00 да 12.00 — першая трэніроўка, пасля полудзень, яшчэ два ўрокі, абед, зноў два ўрокі, і з 16.00 да 18.00 — другая трэніроўка. Плюс — пастаянныя зборы, спаборніцтвы. Ці стануць тутэйшыя дзеці ў будучыні фізікамі або матэматыкамі — пытанне спрэчнае. Але як мінімум настаўнікамі фізкультуры — дакладна.

— Высокага класа спартсменамі становяцца адзінкі, але, тым не менш, і астатнія звязваюць сваё жыццё са спортам, — кажа Алег Самсонаў. — Прафарыентацыя ў нас выразная. Нашы выпускнікі становяцца трэнерамі, настаўнікамі фізічнай культуры, ідуць у сілавыя структуры, там, дзе патрэбна сур'ёзная фізічная падрыхтоўка. Звычайныя дзеці не вытрымліваюць, а нашым там лёгка.

Тое, што такі рэжым правільны, згодны і **Аляксандр ДАРАФЕЕЎ, дырэктар чавускай СДЮШАР**, які адказвае за спартыўную падрыхтоўку гэтых вучняў.

— У нас займаюцца і гарадскія дзеці, якія замест дзвюх трэніровак паспяваюць толькі на адну, а то і зусім прапускаюць, — прыводзіць ён аргумент. — Дзеці, якія наведваюць абласную школу, на іх фоне на галаву мацнейшыя. Хоць займацца пачынаюць аднолькава.

Усяго ў школе вучыцца 108 дзяцей з усіх раёнаў Магілёўскай, Гомельскай, Мінскай абласцей. Гэта падлеткі, якія прайшлі жорсткі адбор трэнерамі-выкладчыкамі і атрымалі шанц стаць чэмпіёнамі. Акцэнт на спорт у гэтай установе быў заўсёды, нават да таго, як яна стала спецыялізаванай. Але такіх умоў, як цяпер, раней не было.

— Усё змянілася дзякуючы нашым дзецям, — кажа Алег Самсонаў. — Яны дабіліся вышынь на міжнародным узроўні, і на нас звярнулі ўвагу. У выніку з'явілася і лыжаролерная траса, рэканструявана зала цяжкай атлетыкі. Цяжкаатлетаў, дарэчы, падтрымлівае Мытны камітэт, які курыруе гэты кірунак. Яны мадэрнізавалі залу, купілі інвентар, абсталяванне.

## Бацькі бачылі Дзінару музыкантам

Школа, дзе будучыя спартсмены грызуць граніт ведаў, на першы погляд мала чым адрозніваецца ад звычайнай, — тыя ж сэнсарныя панэлі, інтэрактыўныя дошкі, камп'ютары. Вось толькі ў калідорах — вялікая колькасць спартыўных кубкаў і фота дзяцей у спартыўнай форме. Сярод іх — вельмі перспектыўны біятланіст Аляксандр Петухоў, які цяпер уваходзіць у спісачны склад зборнай Рэспублікі Беларусь, прызёр рэспубліканскіх спаборніцтваў на дарослым чэмпіянаце па цяжкай атлетыцы Галіна Галаўнёва. Зараз яна вучыцца ў Бабруйскім вучылішчы алімпійскага рэзерву. Будучыя зоркі беларускага біятлона, якіх тут называюць вельмі перспектыўнымі, Алеся Асіпенка і Анастасія Зайцава — неаднаразовыя пераможцы рэспубліканскіх спаборніцтваў па біятлоне. Тут жа — цяжкаатлеты: Ягор Трусевіч, пераможца абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў.

— Пазнаеце? Вунь наша Дзінара, — паказвае на фота Алег Самсонаў. — Гэты здымак зроблены ў 2009 годзе. Родам яна з вёсачкі, што за кіламетраў 10 ад Чавус. Трэнер Андрэй Іваноў заўважыў яе, калі Дзінара займалася на аддзяленні лыжных гонак. Ён яшчэ тады сказаў, што гэта будучая алімпійская чэмпіёнка. Ледзь угаварылі бацькоў аддаць дзяўчынку ў біятлон. Яны бачылі Дзінару музыкантам. Дзяўчынка была ўсебакова развітая, прымала актыўны ўдзел і ў грамадскім жыцці, і ў школьных мерапрыемствах. У 2010-м, пасля васьмі класаў, пайшла вучыцца ў Магілёўскае вучылішча алімпійскага рэзерву. А ў 2018-м стала алімпійскай чэмпіёнкай.

## Жыццё па распарадку

89 дзяцей са 108, якія вучацца ў спецыялізаванай спартыўнай школе, жывуць у інтэрнаце. Рэжым тут строгі. Пад'ём — у 7 гадзін раніцы, прыбіранне, прывядзенне сябе ў парадак, сняданак і — у школу да сама вечара. Затым — самападрыхтоўка да 19.00, вячэра, зноў работа над дамашнімі заданнямі на працягу гадзіны. На асабістыя справы адведзена ўсяго 40 хвілін. Гэта на тэлефоны, перапіскі, сацсеткі. А ў 21.00 адбой. Больш дарослыя маюць магчымасць яшчэ гадзіну пазаймацца, але ў 22.00 усе ўжо павінны спаць. За гэтым сочаць і настаўнікі, і выхавальнікі.

Жывуць будучыя спартсмены аскетычна. У пакоях — нічога лішняга: стол, некалькі крэслаў, тумбачка, ложак, шафа. Тэлевізар — толькі ў пакоі адпачынку. Тэарэтычна ў будучых спартсменаў на яго няма і часу. Пакой № 10, дзе жыла Дзінара Алімбекава, нічым не адрозніваецца ад астатніх: невялікае памяшканне на чатыры ложкі. Так што ніякіх цяплічных умоў. Адно толькі і зачароўвае, што від з вокнаў.

Тэрыторыя вакол вельмі маляўнічая. У спадчыну ад дома-інтэрната засталося некалькі будынкаў, якія цяпер прыстасаваны пад гаспадарчыя аб'екты. У адным з іх раней была цяжкаатлетычная зала, але з уводам новага спартыўнага комплексу патрэба ў ёй адпала. Цяпер тут захоўваецца запасны спартыўны інвентар. Алег Самсонаў з павагай згадвае канадскіх спонсараў, якія дапамагалі палепшыць базу. У гонар аднаго з іх, найбольш руплівага — Дэвіда Кэмбэла, ён нават паклапаціўся ўстанавіць памятны знак. Самы стары будынак — 1946 года пабудовы. Калі быў дзіцячы дом, тут жылі дзеці. Потым яго абсталявалі пад хакейную распранальню. Выхаванцы чавускай школы-інтэрната ўваходзілі ў каманду «Метэор», якая ўдзельнічала ў хакейным турніры «Залатая шайба» на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 2014-м яны занялі прызавое месца ў сваёй падгрупе на абласных спаборніцтвах. Для падтрымання дзяцей у спартыўнай форме спонсары дапамаглі пабудаваць на тэрыторыі абласной школы хакейную каробку. Наогул, вакол школы шмат плоскасных збудаванняў: пляцоўкі для міні-футбола, стрытбола.

А яшчэ проста пад школьнымі вокнамі размясціліся цяпліцы. На 12 гектарах растуць бульба, памідоры, агуркі, морква, буракі. Ёсць два яблыневыя сады. А таксама — невялікі птушнік, дзе кожны дзень нясушкі выдаюць па 50-60 яек.

— Раней у нас і свінні былі, але на ўсё не хапае часу, — усміхаецца дырэктар. — Гаспадаркай займаюцца ў асноўным настаўнікі і тэхнічны персанал.

## Крутыя горкі

Летась побач з абласной школай з'явіўся новы спартыўны аб'ект з лыжаролернай трасай (максімальная вышыня пад'ёму 18 метраў), стрэльбішчам на 18 стралковых установак, трыбунамі на 500 гледачоў, трохпавярховым адміністрацыйна-бытавым будынкам з прэсцэнтрам, канферэнц-залай, трэнажоркай, боксамі для захоўвання і апрацоўкі зброі. Набыта сур'ёзная тэхніка для падтрымання трасы ў рабочай форме: той жа ратрак — трасаўкладчык, які каштуе сотні тысяч беларускіх рублёў.

— Раней мы нават і марыць не маглі, што ў нас будзе такая база, — прызнаецца **трэнер Віталь ЛЕГЧАНКА,** жыццё якога цалкам звязана з чавускай біятлоннай школай. — Але мы абагаўлялі нашых трэнераў Сяргея Кліманкова, Валянціна Новікава — бацьку алімпійскага прызёра Сяргея. Валянцін Фёдаравіч наогул, лічы, родапачальнік гэтага віду спорту ў Чавусах. За апошнія два гады тут кардынальна ўсё памянялася. Раней мы пайдня дабіраліся на стрэльбішчы. Шчыты пастаянна ламалі то людзі, то жывёлы. Зімой або вясной наогул было не даехаць. З сабой трэба везці шмат рознай амуніцыі — без машыны ніяк. А дарогі былі такія, што і машына не праедзе. Сёння ўсё на месцы: зброя, стрэльбішчы, лыжаролерка, распранальні. Узровень — не параўнаць. Цяпер і пушкі ёсць снег насыпаць, і ратрак, каб яго ўтрамбоўваць. Раней па ямках, калдобінах ездзілі. Зараз нават страшна падумаць. База стала сучаснай, і матывацыя дзяцей займацца гэтым відам спорту павысілася.


Трэнер Віталь ЛЕГЧАНКА: «Пра такія ўмовы мы і марыць не маглі».

Адзінае, пра што перажываюць трэнеры, — новая лыжаролерная траса не мае ніводнага роўнага ўчастка. Хоць бы кіламетр дадаць, марыць яны. Гэта ж зусім іншая спартыўная тэхніка. Быў выпадак, калі моцны выхаванец чавускай школы біятлона выехаў на спаборніцтвы ў Гомель. Усе разлічвалі на яго перамогу, а ён прайграў. Прааналізавалі і зразумелі, што ён не трэніраваўся на раўніне. А ў Гомелі траса была раўнінная.

## Ці лёгка вырасціць чэмпіёна

Каля бокса, дзе захоўваецца зброя, знаёмлюся з юнымі біятланістамі. «Ну і хто твае куміры?» — пытаюся ў адной з іх. «Алімбекава, Сола, Кручынкіна, Міронава», — бойка пералічвае вядомыя прозвішчы дзевяцігадовая дзяўчынка. І, убачыўшы маю збянтэжанасць, з усмешкай дадае: «Я ж біятлон гляджу!» Дзяўчынку завуць Мілана Безукладнікава. Запомніце гэта імя на ўсялякі выпадак. Не выключана, што праз некалькі гадоў яно замільгае ў верхніх радках спартыўных табліц.

Сярод трэнерскага складу шмат моладзі. 21-гадовая спартсменка і трэнер Анастасія Шаманоўская нядаўна заняла на чэмпіянаце краіны трэцяе месца. Сама яна з Чавус. Згадвае, што прыйшла ў спорт, каб навучыцца страляць. А потым захапілася лыжамі і ўлюбілася ў біятлон. Цяпер трэніруе такіх жа, як яна, апантаных.

— Ёсць дзеці вельмі здольныя, — кажа яна. — Галоўнае, каб жаданне займацца ў іх не прапала. Гэта руплівая праца, і вельмі доўга прыходзіцца дабівацца вынікаў. Трэба цалкам прысвяціць сябе спорту. Пра яго трэба памятаць кожную хвіліну, нават дома, сачыць за сваім харчаваннем, лічыць калорыі, спаць не меней за 8 гадзін у суткі.

У кабінеце дырэктара СДЮШАР Аляксандра Дарафеева — кубкі на любы густ. І асабліва прэстыжныя са спартакіяд Рэспублікі Беларусь за летні і зімні біятлон, якія праводзіліся ў Наваполацку летась. Чавуская СДЮШАР у краіне самая моцная па выніках мінулага года.

— Мы маленькі раён, але можам ганарыцца, што тры нашы выхаванцы ўваходзяць у склад Нацыянальнай зборнай, трое былі на Алімпійскіх гульнях, з іх — два прызёры і алімпійская чэмпіёнка. І рыхтавалі мы іх без усякіх там умоў, — кажа Аляксандр Рыгоравіч. — Умовы даюць магчымасць лепш трэніравацца, але знайсці і падрыхтаваць чэмпіёна па-ранейшаму вельмі складана. Рассылаем лісты, ездзім на прагляды. Некаторых дзяцей яшчэ адпужвае тое, што прыйдзецца паставіць крыж на свабодзе. Гэта ж бясконцыя трэніроўкі: ні выхадных, ні канікул. У вялікім спорце рэжым яшчэ больш жорсткі. Дацягнуць да Нацыянальнай зборнай атрымліваецца не ў кожнага. Наша задача — «пераласціць» тысячы малых дзяцей і знайсці аднаго-двух таленавітых. А яшчэ — зацікавіць. Некаторым, акрамя камп'ютараў і інтэрнэту, нічога не трэба. Плюс стала больш хворых: скаліёзы, сэрца, зрок. Калі медыкі забракавалі, мы такіх дзяцей не бяром. Радуе толькі тое, што на фоне іншых дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ мы трымаем даволі высокую планку. Ёсць нормы па перадачы юных спартсменаў у школы і вучылішчы алімпійскага рэзерву. І мы гэтыя нормы перавыконваем у два і болей разоў. На працягу года павінны падрыхтаваць трох першаразраднікаў або кандыдатаў у майстры спорту (КМС). Летась мы аднымі КМС план перавыканалі. І гэта пры тым, што ў іншых абласцях ёсць вельмі моцныя спартыўныя школы. Прыпыняцца нельга. У спорце галоўнае — не збавіць тэмпу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**
*г. Чавусы.*


Будучыя чэмпіёнкі адпрацоўваюць стральбу.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# Вясновая зеляніна: прыхаваная пагроза

## Як засцерагчы сябе ад нітратаў?

**Пасля доўгай халоднай зімы вельмі хочацца папоўніць вітамінны запас — і не з дапамогай «вітамінак» без смаку, а пахрумсцець свежым зялёным салацікам. Ды і медыкі раяць налягаць на вясновую зеляніну. Вось толькі замест чаканай карысці ядомыя травы могуць нанесці здароўю сур'ёзную шкоду.**

Справа ў тым, што зеляніна актыўна назапашвае ў сваім лісці нітраты (у якіх, як вядома, ні смаку, ні паху — адно негатыўнае ўздзеянне). Дык што ж рабіць гараджаніну? Адмовіцца ад вясновай зялёнай салаты? Вырошчваць цыбулю і пятрушку на падаконніку? Або махнуць рукой на магчымыя наступствы і адправіцца на рынак па шпінат і рукалу?..

## З ЧЫМ ІХ ЯДУЦЬ?

Нітраты — гэта солі азотнай кіслаты. Яны неабходныя раслінам для росту і развіцця. Уласна кажучы, нітраты прысутнічаюць у сілкаванні любой расліны. Гэта натуральны складнік раслінных прадуктаў. Казаць аб небяспецы варта, калі ўзровень нітратаў перавышае норму.



Беларускія кроп, пятрушка, рукала і цыбуля выглядаюць цалкам канкурэнтаздольна.

— Нітраты выкарыстоўваюцца для ўгнаення глебы, каб паскорыць паспяванне гародніны і садавіны, атрымаць большы ўраджай, — гаворыць **Алена КРАСОЎСКАЯ, загадчык лабараторыі фізіка-хімічных даследаванняў Рэспубліканскага кантрольна-выпрабавальнага комплексу па якасці і бяспецы прадуктаў харчавання.** — Калі нітратаў паступае больш, чым расліна можа ператварыць у арганічныя злучэнні, то пачынаецца працэс назапашвання ў лісці, клубнях, пладах і караняплодах. Пры невялікім спажыванні нітратаў з ежай яны не назапашваюцца, лёгка і хутка выводзяцца з арганізма.

Калі пры вырошчванні раслін уносіцца занадта шмат угнаенняў, змяняецца біяхімічны склад ядомых раслін: рэзка скарачаецца колькасць вітамінаў і мікраэлементаў, і з карыснай раслінная ежа ператвараецца ў шкодную.

— Назапашванне нітратаў у раслінах залежыць ад комплексу прычын, — гаворыць спецыяліст. — Ад біялагічных асаблівасцяў саміх раслін і іх сартоў; ад узросту раслін (нітратаў больш у ранняй гародніне, чым у позняй); ад рэжыму мінеральнага харчавання раслін, ад фактараў навакольнага асяроддзя (тэмпературы, вільготнасці паветра, працягласці светлавога дня). Нармальная асветленасць раслін зніжае ўтрыманне нітратаў, таму ў цяплічных раслінах нітратаў больш.

## НАКОЛЬКІ ГЭТА НЕБЯСПЕЧНА?

Гранічна дапушчальная норма нітратаў для дарослага чалавека — 5 мг на кілаграм вагі. Гэта досыць шмат, адзначаюць спецыялісты: каб атрымаць такую канцэнтрацыю, нітратную зеляніну трэба есці кілаграмамі. І ўсё ж небяспека ёсць.

— Пад уздзеяннем ферменту нітратрэдуктазы нітраты аднаўляюцца да нітрытаў, якія ўзаемадзейнічаюць з гемаглабінам крыві. У выніку ўтвараецца рэчыва метгемаглабін, які ўжо не здольны пераносіць кісларод. Таму парушаецца нармальнае дыханне клетак і тканак арганізма (тканкавая гіпаксія), у выніку чаго назапашваецца малочная кіслата, халестэрын і рэзка падае колькасць бялку, — расказвае суразмоўніца. — Нітраты спрыяюць развіццю патагеннай кішачнай мікрафлоры, якая выдзяляе ў арганізм чалавека таксіны, у выніку чаго адбываецца атручванне. Яны зніжаюць утрыманне вітамінаў у ежы, якія ўваходзяць у склад шматлікіх ферментаў, а праз іх уплываюць на ўсе віды абмену рэчываў. Пры працяглым паступленні нітратаў у арганізм чалавека памяншаецца колькасць ёду, што прыводзіць да павелічэння шчытападобнай залозы. Устаноўлена, што нітраты моцна ўплываюць на ўзнікненне ракавых пухлін у страўнікава-кішачным тракце чалавека.

Найбольшая колькасць нітратаў, нагадаем, змяшчаецца менавіта ў парніковай гародніне і садавіне, а таксама ў парніковай зеляніне — той, якую толькі і можна купіць вясной і на рынках, і ў крамах.

— У асноўным нітраты назапашваюцца ў каранях, караняплодах, сцёблах, чаранках і буйных жылках лісця, значна менш іх у пладах. З гародніны больш за ўсё нітратаў змяшчаецца ў салаце (асабліва цяплічнай), маладых кабачках, у рэдзьцы, пятрушцы, радысцы, бураках, ранняй капусце, кропе.

Чэмпіён па назапашванні нітратаў сярод «першых прывітанняў цёплага сезона» — ранняя парніковая радыска. Пры няправільным яе вырошчванні ўтрыманне шкодных азотных соляў у яе хрумсткай мякаці можа складаць больш за 70 %. Таксама лідзіруюць сярод зеляніны па схільнасці назапашваць нітраты пятрушка і сельдэрэй.

Зразумець на вока, які «кандыдат у салату» дастойны быць з'едзеным вамі, а які «перакормлены ўгнаеннямі», складана. Відавочна, напрыклад, што кроп у гэты час года, хутчэй за ўсё, будзе з тоненькім сцяблом і вясёленькага салатавага колеру, а не магутным, разлапістым, інтэнсіўна-зялёнага тону. Правіла такое: чым ярчэйшая афарбоўка маладой гародніны і зеляніны, тым большая верагоднасць, што яны «перакормленыя». У той жа час колер часта бывае проста прыкметай сорту. Словам, дакладна ўстанавіць, у норме або ў лішку нітраты ў зеляніне, можа толькі лабараторны аналіз.

— Выключана перавышэнне нормы, калі тавар прайшоў сертыфікацыю, — расказвае Алена Красоўская. — Гэта выпрабаванні па паказчыках якасці і бяспекі, у тым ліку і па ўтрыманні нітратаў, па выніках якіх афармляецца пратакол выпрабаванняў. Пры куплі гародніны і садавіны, асабліва на рынку, неабходна патрабаваць гэтыя дакументы ў прадаўцоў.

Таму спецыялісты раяць купляць зеляніну ва ўстаноўленых месцах — у крамах і на рынках.

## МАЛАДЫЯ ДЫ РАННІЯ

Каб пагутарыць аб нітратах, а заадно прыцаніцца да маладой зеляніны, адпраўляемся на рынак «Новы Лебядзіны». Рынак узнік пару гадоў таму, калі частку тэрыторыі «Лебядзінага» аддалі пад забудову, а частку гандлёвых радоў, адпаведна, перанеслі ў вёску Табары. Мінчане так і не пратапталі «народную сцежку» на новы рынак. Пакупнікоў тут заўсёды менш, чым на Камароўцы або на «старым Лебядзіным». Затое і цэны меншыя. Напрыклад, на тую ж зеляніну.

— У нас танней, чым на Камароўцы: не па ўсіх пазіцыях, але па многіх, — кажа дзяўчына-прадавец аднаго з «зялёных» гандлёвых пунктаў.

Яе асартымент — толькі зеляніна: ад кропу-пятрушкі і розных відаў салаты да рукалы, мяты і чабору.

— Улетку толькі сваёй зялёнай гандлюем, а цяпер пакуль амаль усё імпартнае: Ізраіль, Італія, Іспанія. Крыху пазней будуць Азербайджан і Украіна. А потым і наша зеляніна падрасце.

Дарэчы, як расказалі спецыялісты Рэспубліканскага кантрольна-выпрабавальнага комплексу па якасці і бяспецы прадуктаў харчавання, зеляніна, гародніна і садавіна імпартуюцца ў Беларусь з больш чым 20 краін. Лідзіруючыя пазіцыі займаюць Іспанія, Нідэрланды, Польшча, Турцыя. Зеляніна, як і іншыя садавіна і гародніна, падлягае рэалізацыі на падставе дэкларацыі аб адпаведнасці, якую выдаюць пасля лабараторных даследаванняў па ўтрыманні нітратаў, пестыцыдаў, патагенных мікраарганізмаў, таксічных элементаў.

А вось Соф'я, прадавец з прылаўка па суседстве, гандлюе беларускай зелянінай ужо цяпер, хоць ёсць у яе ў асартыменце і «замежнікі». Сваю зеляніну суразмоўніца вырошчвае ў вёсцы Хацежына, пад Мінскам. Але пакуль не гандлюе ўласным ураджаем.

— Летам будзем прадаваць сваё, а пакуль закупляем.






У крамах зеляніна даражэйшая, чым на рынках.

На яе прылаўку няма размарыну або кінзы, але беларускія кроп-пятрушка і зялёная цыбуля — цалкам канкурэнтаздольнага выгляду.

— Кропчык і цыбуля па рублі, салата — рубель дваццаць, а будзеце браць вялікімі пучкамі, то за восем рублёў кілаграм аддам, — пералічвае яна. — А калі вам патрэбны «заморскія» травы, прайдзіце далей па гэтым радзе.

***— А зеляніну тут правяраюць на нітраты?***

— Вядома! Кожны тыдзень праводзяцца праверкі: на кожным пункце прадаўцы здаюць узоры. Гэта ў дадатак да таго, што без санітарнай праверкі грузу ні адна грузавая машына на рынак не заедзе.

***— Першую зеляніну лепш браць беларускую або імпартную?***

— Вы ведаеце, часам нашаму вытворцу складана давяраць. Нават калі (да прыкладу) пачынаюцца першыя агуркі — яны ж часам бываюць не зялёныя, а блакітнаватыя нейкія — так іх «захімічваюць»! Калі гаворка ідзе пра буйную вытворчасць — той жа «Мінскі цяплічны камбінат» ці буйныя гаспадаркі Брэсцкай вобласці, — там тэхнолагі працуюць і ўгнаенні сыплюць па норме. А што прыватнік насыпаў — хто яго ведае!

***— А гараджане лічаць, што лепш у бабулі купляць, чым у краме...***

— І дарэмна. Бабулі на гноі вырошчваюць: у многіх з іх проста няма грошай на добрыя азотныя ўгнаенні. А арганіка якраз і можа стаць прычынай назапашвання нітратаў у зеляніне і гародніне. Бывае, прыватнік і дарагія азотныя ўгнаенні сыпле на вочка. Зеляніна ў такога вырастае прыгожая, але «нітратная». Усё ад гаспадара залежыць. Калі гаспадар дасведчаны (вось у нас з мужам, напрыклад, вышэйшая аграномічная адукацыя), то яго прадукцыя будзе карыснай, а не шкоднай.

***— А наогул людзі купляюць зеляніну?***

— Зараз беларусы ўжо прывучыліся есці зеляніну, раней горш бралі. Але і прапанова стала большай, канкурэнцыя вышэйшай. Я дзесяць гадоў ужо зяленівам займаюся і не сказала б, што гэтай вясной продажы вышэйшыя або ніжэйшыя, чым пару гадоў таму.

— Ды не, менш сталі браць, — не згаджаецца Ганна, яшчэ адзін прадавец зеляніны. Яна гандлюе ўжо ўласным ураджаем. — Эканомяць усе, грошай у людзей менш. Бывае, цяпер бяруць кроп-пятрушку-цыбулю так, каб у агульнай складанасці 100 грамаў атрымалася — на рубель...

Вырошчвае зеляніну яе сям'я ў ацяпляемых парніках у Слуцкім раёне, а яна прадае на рынку.

— Кінза, шпінат, рукала — усё цяплічнае, наша, — распавядае Ганна. — Вось у вас у горадзе яшчэ толькі вясна наступіла, а мы ўжо ўсё пасадзілі. Шэсць парнікоў — шэсць «буржуек», і ў кожную печ трэба кожныя дзве гадзіны падкідваць кошык торфу.

Нягледзячы на запэўніванні прадаўцоў, на самай справе ў сярэднім па «Новым Лебядзіным» цэны на зеляніну аказаліся супастаўнымі з Камароўкай, а дзе-нідзе і вышэйшыя. Так, кроп-пятрушку-зялёную цыбулю тут прадаюць па рублі за 100 грамаў, але калі пучок буйны, скінуць да 80 капеек. Ліставая салата каштуе рубель 20 капеек за 100 грамаў, кінза — 2 рублі за тую ж колькасць, шпінат — 2,5, рукала — 2,5—3 рублі, базілік — 4 рублі, а радыска (ізраільская) — 3,5-4 рублі.

Для параўнання: на Камароўцы 100 грамаў зялёнай цыбулі можна купіць за 80 капеек, пятрушка і кроп абыдуцца ў той жа рубель, рукала — тыя ж 2,5 рубля і столькі ж каштуе 100 грамаў шпінату. Даражэйшыя на рынку ў цэнтры Мінска шалфей і базілік — 5 рублёў, а таксама ў сярэднім на 50 капеек даражэйшыя на Камароўцы размарын і чабор (4 рублі).

Ну, і цэны на зеляніну ў гіпермаркетах... Яны, дарэчы, ў разы вышэйшыя, чым на рынках: паўтара рубля за 100 грамаў зялёнай цыбулі, чатыры рублі 70 капеек за рукалу, тры — за 100 грамаў кропу або пятрушкі, пяць рублёў за шпінат і восем — за размарын.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

### ПРАВІЛЫ САЛАТЫ

**Праверкі праверкамі, але пакупніку нялішне будзе ведаць, як засцерагчы сябе ад нітратаў.**

✓ Перш за ўсё зеляніну варта трымаць толькі ў халадзільніку: у цяпле ўзровень нітратаў у лісці павышаецца.

✓ Свежую салату, запраўленую алеем ці смятанай, захоўваць не варта — лепш з'есці яе адразу пасля прыгатавання. Захоўванне салаты павышае ўтрыманне нітратаў у яе складовых частках.

✓ Выкарыстоўвайце ў ежу толькі лісце. Сцёблы ў большай ступені назапашваюць солі азотнай кіслаты.

✓ Лісце салаты перад ужываннем у ежу замачыце ў растворы харчовай соды (1 ст. л. на 1 л вады) на 30 хвілін і пазбавіцеся палавіны нітратаў, што знаходзіцца ў ім. Пасля «содавай ванны» лісцікі прамыйце пад праточнай вадой.

✓ Іншую зеляніну 10 хвілін вымочваюць у дзесяціпрацэнтным растворы паваранай солі. І таксама апалоскваюць чыстай праточнай вадой перад ежай.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

9 красавіка 2021 г. № 13 (598)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


КАРЫСНЫ ВОПЫТ

## ВОСЬ ТАК У БАБРУЙСКУ ВЫХОЎВАЮЦЬ САПРАЎДНЫХ ПАТРЫЁТАЎ



bobrlife.by

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў азнаёміліся з вопытам арганізацыі работы тутэйшых устаноў адукацыі



**«Бабруйск з'яўляецца адной з адукацыйных пляцовак, дзе на вельмі высокім узроўні пастаўлена і дашкольная, і сярэдняя, і сярэдняя спецыяльная адукацыя», — менавіта так выказаўся пра сістэму адукацыі горада на Бярэзіне дэпутат Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК, пад кіраўніцтвам якога тут нядаўна прайшло выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы. Дэпутаты наведалі яслі — дзіцячы сад № 84 і школу № 34, якія адкрыліся зусім нядаўна. Па сутнасці, гэта своеасаблівыя эталоны сярод навучальных устаноў, што адпавядаюць усім патрабаванням.**

### Тут дзеці не сумуюць

У канцы мінулага года ў Сёмым мікрараёне Бабруйска адкрыліся сучасныя яслі — дзіцячы садок на 240 месцаў. Аб'ект звяртае на сябе ўвагу яшчэ знадворку. Вабяць пляцоўкі з яркім гульнявым і спартыўным абсталяваннем, прыгожыя альтанкі. У трохпавярховым корпусе казка працягваецца. Навучэнцы Бабруйскага мастацкага каледжа імя А. Ларына дапамаглі афарміць сцены ўстановы ў беларускіх матывах. Створаны добрыя ўмовы для выхавання гарманічнайва ўсіх адносінах асобы. Ёсць гімнастычная, спартыўная, музычная залы, нават басейн: вялікі, светлы, прасторны, са спецыяльным пад'ёмнікам для дзяцей з праблемамі апорна-рухальнага апарату. Пра такі дзіцячы садок для свайго малога марыць кожная маці.

— У нас выхоўваюцца дзеткі з двух гадоў да шасці, — удакладняе **загадчыца ясляў — дзіцячага сада № 84 Таццяна АРЦЮШЭНЯ.** — І ўсім тут камфортна.

Дэпутатаў дзеці сустракалі караваем, дэкламавалі ім вершы на беларускай мове. Потым дарослыя паказалі ўсю тутэйшую прыгажосць: утульныя групы для дзяцей, медыцынскі блок, суперсучасны харчовы блок з поўным наборам перадавога абсталявання: параканвектаматам, слайсерам, электраплітамі апошняга пакалення, электрапатэльняй, вялікім міксерам, якім можна хутка ўзбіць пюрэ.

Пакой для бяспекі — асаблівы гонар: абсталяваць яго дапамаглі супрацоўнікі МНС. Шафа — у выглядзе пажарнай машыны, ёсць нават спецадзенне для юных ратавальнікаў. Для прагляду карыснага матэрыялу ўстаноўлены спецыяльны экран. Ратавальнікі дэманструюць дзецям фільмы і слайды на тэму бяспекі. І робяць гэта нясумна. Таццяна Іванаўна адзначае, што пасля іх садка такія пакоі сталі з'яўляцца і ў іншых дашкольных установах, бо карысць ад іх сапраўды вялікая.

— Наша ўстанова своеасаблівая: з 240 дзяцей 211 — са шматдзетных сем'яў, — удакладняе Таццяна Арцюшэня. — І сярод персаналу многа шматдзетных мам. Працаваць з імі вельмі лёгка. Яны разумеюць адказнасць і ўлічваюць інтарэсы ўстановы.

Дарэчы, з верасня на базе садка будзе працаваць група для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення.

### Запрашаем у лега-клас

Школа № 34, дзе таксама пабывалі дэпутаты, — адна з інавацыйных, пабудавана ўсяго два з паловай года назад. У класах — інтэрактыўныя дошкі, мультыборды. У вучняў — электронныя дзённікі і асабістыя карткі.

— Наша ўстанова ўнікальная, — кажа **дырэктар Ірына МАТУЗАВА.** — Тут вельмі добрая як вучэбная, так і спартыўная база. Класы абсталяваны ўсім неабходным, для першакласнікаў ёсць клас лега. Дзеці выкладваюць дэталі пэўнага колеру і такім чынам асвойваюць лік, чытанне. У маленькіх пераважае гульнявая дзейнасць, і канструктар дапамагае адаптавацца.

А яшчэ ў школе ёсць факультатыў па скрэтч-праграмаванні, які наведваюць дзеці пачынаючы з другога класа, і па робатапраграмаванні, дзе вучні з 3-4 класа вучацца праграмаваць аўтаматычныя прыстасаванні. Вельмі развіты экалагічны кірунак. Дзеці, у якіх да гэтага схільнасці, пачынаючы з чацвёртага класа наведваюць экацэнтр. У школе моцная спартыўная база, тут ёсць усё: ад скаладрома да суперсучасных залаў, аснашчаных спартыўным інвентаром і трэнажорамі. А яшчэ — 25-метровы басейн невялікай ёмістасці, дзе плаваюць малыя. Нядзіўна, што ў школе ёсць нават клас па плаванні. Так дзяцей матывуюць далучацца да алімпійскага руху. Для творчых асоб таксама ёсць умовы. Напрыклад, можна займацца харэаграфіяй або маляваннем. Магчымасцяў развіваць сябе шмат, і дзецям працей зрабіць правільны выбар.

***(Заканчэнне на 18-й стар.)***

АКТУАЛЬНА

## ЗЯМЛЯ І ЗАКОН

**ПАДЧАС выязнога пашыранага пасяджэння Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні разгарнулася дыскусія вакол новай рэдакцыі дзеючага закона «Аб геадэзічнай і картаграфічнай дзейнасці». Таксама было абмеркавана пытанне аб новых падыходах у рабоце са старымі і пустымі дамамі з улікам Указа Прэзідэнта «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустымі дамамі».**

### З космасу відаць лепш

Пасяджэнне прайшло пад кіраўніцтвам **старшыні камісіі Міхаіла РУСАГА** ў аграгарадку Прылукі Мінскага раёна на базе дзяржаўнага прадпрыемства «БелПСХАГІ». Гэта прадпрыемства ўваходзіць у структуру Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. У краіне яно безумоўны лідар у выкананні аэраздымачных работ, апрацоўцы лічбавых аэрафотаздымкаў, выкананні комплексных праектаў па землеўпарадкаванні, геадэзічным і картаграфічным забеспячэнні праектных і будаўнічых работ. Прадпрыемства мае сучаснае абсталяванне, тут працуюць кваліфікаваныя спецыялісты.

Але іх дзейнасць магла б быць больш эфектыўнай і выніковай, а значыць, і больш карыснай для эканомікі краіны. Як расказаў **намеснік старшыні Дзяржкамітэта Мікалай БАБЁР,** за апошнія гады назіраецца істотны прарыў у развіцці тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца ў геадэзіі і картаграфіі. Наспеў час прывесці гэтыя змены ў адпаведнасць з нормамі заканадаўства. Напрыклад, развіццё спадарожнікавай сістэмы дакладнага пазіцыянавання не адлюстравана ў законе. А трэба. Увогуле, апошнія змены былі ўнесены яшчэ ў 2008 годзе.

Аб неабходнасці актуалізацыі і ўдасканалення палажэнняў закона выказваліся ўсе спецыялісты, якія маюць дачыненне да геадэзіі і картаграфіі.

Міхаіл Русы актыўна падтрымаў прапановы аб зменах у гэтым законе. Больш за тое, сенатар ініцыяваў запрашэнне да ўдзелу ў пасяджэнні камісіі кіраўнікоў шэрагу міністэрстваў і ведамстваў. У зале таксама прысутнічала і група рэктараў, прарэктараў і дэканаў ВНУ краіны.

### Больш яснасці з пустымі дамамі

А вось да размовы па другім актуальным зямельным пытанні былі запрошаны старшыні абласных і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, некаторых райсаветаў дэпутатаў. І невыпадкова. Разглядалася па-ранейшаму злабадзённая праблема — лёс кінутых, пустых і аварыйных дамоў. Любы старшыня сельсавета вам скажа, што пытанне кінутых дамоў не з прыемных, абавязкова паведаміць пра клопаты і галаўны боль, якое яно выклікае. Цяпер ёсць упэўненасць у тым, што новыя падыходы ў справе адчужэння жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленне работы з пустымі дамамі дапамогуць у рэгіёнах вырашаць гэтыя праблемы хутчэй, а часам — яшчэ і на стадыі іх узнікнення.

Больш падрабязна пра новаўвядзенні ў гэтай сферы расказала **намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Кацярына ЛУК'ЯНАВА.** Паводле яе слоў, вышэйзгаданы ўказ рэгулюе два блокі важных пытанняў.

Першы датычыцца сельскай мясцовасці і гарадоў раённага падпарадкавання. Цяпер там значна спрошчаны парадак адчужэння і продажу жылых дамоў, якія былі пабудаваны да 8 мая 2003 года. У асобных сітуацыях такія дамы могуць адчужацца нават і без наяўнасці адпаведных дакументаў. Ва ўласнасць дом пераходзіць з моманту заключэння дагавора куплі-продажу і занятыя зямельнага ўчастка. Новы гаспадар можа без абавязковай рэгістрацыі на працягу года займацца капітальным рамонтам дома, які ён набыў у перадаварыйным стане, апрацоўваць зямельны ўчастак, а дакументы афарміць пасля рэканструкцыі. Але, згодна з указам, прадаць дом па спрошчанай схеме дазваляецца толькі адзін раз.

Другі блок пытанняў звязаны з пустымі дамамі. Зараз, па звестках Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, у краіне прыкладна сем тысяч пустых дамоў. Асабліва іх шмат у Гомельскай вобласці, крыху менш у астатніх рэгіёнах, але таксама дастаткова. Што рабіць з гэтай непрывабнай нерухомасцю? Сёння рэалізоўваецца адзіны падыход да так званых кінутых дамоў, спрошчаны механізм прызнання іх пустымі ці аварыйнымі. Выключна ў пэўных выпадках могуць зніжаць цэны на такія дамы ажно да адной базавай велічыні.

Цікавы момант. Сёння з'явілася магчымасць набыць грамадзяніну пусты дом з растэрміноўкай на тры гады, але толькі пры ўмове, што нерухомасць выстаўлена на продаж органам мясцовай улады. Таксама спрашчаецца працэдура зносу зусім трухлявых пабудоў, якія вось-вось абваляцца. Прычым гэта датычыцца і двухпавярховых аварыйных дамоў, што раней не віталася.

***(Заканчэнне на 8-й стар.)***

# ДЗІЦЯЧЫ КВАРТАЛ, АДКРЫТЫ ДЫЯЛОГ І ЎШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ

## Старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі Віктар Лісковіч здзейсніў рабочую паездку ў Брэст

**СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, намеснік старшыні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці Віктар ЛІСКОВІЧ правёў у Брэсцкім абласным выканаўчым камітэце прыём непаўналетніх і іх законных прадстаўнікоў у рамках дзейнасці профільнай нацыянальнай камісіі.**



### Карысны вопыт дзіцячага квартала

Парламентарый адказаў на пытанні, якія датычацца забеспячэння харчаваннем дзяцей, якія навучаюцца ва ўстановах адукацыі, іншых мер іх сацыяльнай абароны. Былі разгледжаны прапановы аб змяненні заканадаўства ў частцы функцыянавання дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, правядзення рэспубліканскага фестывалю для папулярызацыі сямейных форм уладкавання дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама меры па фарміраванні пазітыўнага грамадскага меркавання ў пытаннях выхавання дзяцей у сем'ях, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

Бацька-выхавальнік Віталь Іваноў расказаў аб праекце «Дзіцячы квартал на Васняцова», які аб'ядноўвае пяць дзіцячых дамоў сямейнага тыпу Маскоўскага раёна Брэста. Разам з бацькамі-выхавальнікамі дзеці праводзяць розныя акцыі, удзельнічаюць у гарадскіх мерапрыемствах.

— На базе дзіцячага квартала можна зрабіць інавацыйную вучэбна-выхаваўчую пляцоўку, мы гатовы дзяліцца вопытам, — расказаў Віталь Іваноў. — Гэты праект як прыклад супрацоўніцтва дзіцячых дамоў можам паказаць на рэспубліканскім узроўні. Гатовыя правесці фестываль у мэтах папулярызацыі сямейных форм уладкавання.

Віктар Лісковіч падтрымаў ініцыятыву і агучыў магчымасць правядзення пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі на базе дзіцячага квартала ў Брэсце як дэманстрацыйнай мадэлі развіцця дзіцячых дамоў сямейнага тыпу.

— Усе пытанні, якія паступілі, будуць абагульнены і прадстаўлены ў Нацыянальную камісію па правах дзіцяці, перададзены ў Міністэрства адукацыі, іншыя рэспубліканскія органы дзяржкіравання. Будзем акумуляваць і выкарыстоўваць атрыманыя прапановы пры падрыхтоўцы законапраектаў, — адзначыў сенатар.

Падобныя сустрэчы намеснік старшыні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці мае намер праводзіць рэгулярна, штомесяц выязджаючы ў рэгіёны. Наступны прыём непаўналетніх грамадзян і іх законных прадстаўнікоў плануецца правесці ў Гомелі.

### Шчыра і адкрыта

Таксама падчас наведвання Брэста старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі абмеркаваў актуальныя пытанні маладзёжнай палітыкі.

Ён правёў сустрэчу з членамі Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь ад Брэсцкай вобласці і Маладзёжнага парламента пры Брэсцкім абласным Савеце дэпутатаў.

У фармаце адкрытага і шчырага дыялогу ўдзельнікі сустрэчы абмеркавалі актуальныя пытанні маладзёжнай палітыкі, удасканалення сістэмы рэгіянальнага развіцця, канцэпцыю прафесійнай арыентацыі і перспектывы кар'ернага росту таленавітай моладзі з улікам сучасных тэндэнцый рынку.

Актывісты Маладзёжнага парламента расказалі пра сваю дзейнасць на ўзроўні горада, раёна і вобласці, адзначылі важнасць узаемадзеяння з Саветамі дэпутатаў усіх узроўняў.

Адным з пунктаў наведвання сенатарам абласнога цэнтра стаў таксама мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой».

Разам з прадстаўнікамі Маладзёжнага парламента Брэсцкай вобласці парламентарый азнаёміўся з найбуйнейшым на постсавецкай прасторы помнікам мужнасці савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, дзе адбылася ўрачыстая цырымонія ўскладання вянкоў і кветак да Вечнага агню.

З вялікай цікавасцю маладыя людзі слухалі аповед пра бітвы доблесных салдат за Радзіму, за тое, каб іх нашчадкі жылі пад мірным небам. Маладыя людзі наведалі ўнікальны турыстычны аб'ект — музей гісторыі фартыфікацыі і ўзбраення «5 форт» і выставу ваеннай тэхнікі часоў Другой сусветнай вайны. Адной з асаблівасцяў гэтага музея з'яўляецца тое, што тут для агляду адкрыты абсалютна ўсе збудаванні форта, у тым ліку і падземныя калідоры.

Усе ўдзельнікі мерапрыемства атрымалі шмат эмоцый і ўражанняў, мелі магчымасць адчуць гонар за гераічнае мінулае сваёй Радзімы.

Як падкрэсліў Віктар Лісковіч, наведванне моладдзю месцаў баявой славы спрыяе фарміраванню ў яе грамадзянскасці і патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця любові і павагі да сваёй Радзімы, пачуцця гонару за дасягненні Рэспублікі Беларусь.

# ЗЯМЛЯ І ЗАКОН

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Прадугледжаны парадак дзеяння выканкамаў па выяўленні кінутых дамоў і ўключэнні іх у Адзіны рэестр пустых дамоў. Ён пачне дзейнічаць з 1 студзеня 2023 года і будзе ўяўляць сабой адкрытую адзіную базу даных. Там будзе акумулявацца і рэгулярна аднаўляцца інфармацыя па кожным такім аб'екце: месцазнаходжанне, фізічны стан ці ступень зношанасці, іншыя характарыстыкі. Кожны ахвотны можа пацікавіцца рэестрам у інтэрнэце.

Вядома, новыя падыходы дапамогуць мясцовым уладам вырашаць пытанні ў прававым полі з такімі дамамі, але ў той жа час дададуць дадатковых клопатаў. Аднак бясспрэчны плюс у тым, што сёння з'явілася больш яснасці і варыянтаў работы з пустымі дамамі. Ды пры гэтым кожны канкрэтны выпадак прыйдзецца разглядаць індывідуальна.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА,**
*Мінскі раён.*

# ПРЭФЕРЭНЦЫІ — ІНАВАЦЫЙНЫМ АБ'ЕКТАМ

**СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ наведала таварыства з абмежаванай адказнасцю «Мінскі гарадскі тэхнапарк».**

Падчас сустрэчы з кіраўніцтвам і працоўным калектывам парламентарый абмеркавала пытанні канстытуцыйнай рэформы і партыйнага будаўніцтва, павышэння ролі мясцовага кіравання і самакіравання, развіцця эканомікі, сацыяльнай сферы і маладзёжнай палітыкі, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

Таксама сенатар азнаёмілася з дзейнасцю найбуйнейшага тэхнапарка краіны, пагутарыла з яго рэзідэнтамі, якіх налічваецца каля 40 прадпрыемстваў, расказала аб дзейнасці па ўдасканаленні заканадаўства ў частцы льгот і прэферэнцый суб'ектам інавацыйнай інфраструктуры.





# ПА СУТНАСЦІ СПРАВЫ

**Член Прэзідыума Савета Рэспублікі Міхаіл РУСЫ арганізаваў прамежкавы кантроль па зваротах грамадзян.**

Па даручэнні Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай кіраўнік Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні арганізаваў кантроль па зваротах грамадзян з выездам на месца. У прыватнасці, у верхнюю палату парламента звярталіся жыхары аграгарадка Наваселле Мінскага раёна і мінчане. Высветліць, як ідзе вырашэнне праблем заяўнікаў, разам са старшынёй профільнай камісіі змаглі і старшыні Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Бугроў і іншыя зацікаўленыя службовыя асобы.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, пытанні датычыліся парушэнняў, дапушчаных пры будаўніцтве жылога дома, а таксама капітальнага рамонту.

Удзельнікі камісійна ацанілі якасць будаўнічых і рамонтных работ. Усе ўзнятыя пытанні знаходзяцца на дадатковым кантролі.

# НА КАНТРОЛІ

**Член Прэзідыума Савета Рэспублікі Таццяна РУНЕЦ разгледзела калектыўны зварот з выездам на месца**

Па даручэнні спікера Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах узяла пад асабісты кантроль разгляд калектыўнага звароту жыхароў дома № 80 па вуліцы Нёманская ў сталіцы. Парламентарый сумесна са старшынёй Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэем Бугровым і прадстаўніком адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска выехала на месца, каб азнаёміцца з незавершаным і незакансерваваным будаўнічым аб'ектам.

Як патлумачылі ў профільнай камісіі, збудаванне ўяўляе сабой нежылую частку шматпавярховага жылога дома з убудаванымі памяшканнямі грамадскага прызначэння і падземнай паркоўкай.

Натуральна, што недабудаваны і не здадзены ў эксплуатацыю камерцыйным забудоўшчыкам аб'ект дастаўляе шэраг незручнасцяў жыхарам дома і не дазваляе гарадскім службам добраўпарадкаваць прылеглую да будынка тэрыторыю.

У найбліжэйшы час у Савеце Рэспублікі пройдзе нарада з прадстаўнікамі Мінгарвыканкама, гарадскога Савета дэпутатаў і іншымі зацікаўленымі асобамі для прыняцця рашэння па праблемах, агучаных у звароце.

Пытанне знаходзіцца на кантролі ў Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.



# РЭКОРДНЫ АДБОР

**Радыёконкурс «Маладыя таленты Беларусі» паставіў новы рэкорд у гісторыі свайго існавання. У ходзе адборачнага тура арганізатары праекта атрымалі больш за 630 заявак ад юных выканаўцаў з усёй краіны.**

Як заўважыла аўтар і кіраўнік творчага спаборніцтва Тацццяна Якушава, гэтая лічба перавышае леташні вынік у паўтара раза. Традыцыйна найбольш заявак сабралі намінацыі «Эстрадны вакал» і «Інструментальная музыка».

— Верагодна, за перыяд вымушаных каранцінных абмежаванняў беларускія рабяты засумавалі па профільных конкурсах, дзе можна паказаць сваё ўмельства і атрымаць на гэта кампетэнтны водгук майстроў мастацтва. Наш праект — з'ява па-свойму ўнікальная для музычнага жыцця краіны, і мы рады, што нават




у фармаце дыстанцыйных праслухоўванняў ён штогод павялічвае ахоп і карыстаецца цікавасцю слухачоў. Да таго ж юбілейны конкурс сёлета прапаноўвае пашыраную колькасць намінацый — іх дзевяць па самых розных музычных напрамках, таму, думаю, кожны змог знайсці для сябе ідэальную катэгорыю. А наступнае слова — за экспертным журы, — адзначае Тацццяна Якушава.

Цяпер да 10 красавіка прафесійнае журы прагледзіць відэазапісы выступленняў усіх удзельнікаў (па ўмовах I тура гэта выкананне вакальнага ці інструментальнага твора беларускага аўтара) і вырашыць, хто з удзельнікаў пройдзе ў наступны тур творчага спаборніцтва ў сваёй катэгорыі. Нагадаем, ацэньваць майстэрства маладых выканаўцаў будуць вопытныя артысты эстрады і тэатра, кіраўнікі музычных калектываў, навуковыя супрацоўнікі профільных устаноў адукацыі. А ўзначальвае судзейскую калегію народны артыст Беларусі Леанід Захлеўны.

Сачыць за навінамі конкурсу «Маладыя таленты Беларусі» можна ў эфіры Першага нацыянальнага, на сайце www.radio1.by і ў Telegram-канале, а таксама ў інфармацыйных выпусках Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі.

**Алена ДРАПКО.**

# ШАШКІ

**(«Звязда»)** **Выпуск № 137**

Адбыўся чэмпіянат Мінскай вобласці па шашках-64 сярод мужчын і жанчын — індывідуальны па зроку. У мужчын перамог Аляксандр Кур'ян, у жанчын — Лясун Марыя (абодва — Барысаў).

№ 41



№ 41 Н. Захараў, у апрацоўцы вядучага аддзела.

**Белыя простыя шашкі:** c1, e1, b2, d2, f2, e3, d4, h4, c5, d6 (10)

**Чорныя простыя шашкі:** h2, a3, f4, g5, b6, f6, a7, e7, d8, f8 (10)

№ 42 Ю. Мурадаў (Барысаў)

**Белыя простыя шашкі:** c1, a3, f4, h4, c5, h6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** d2, f2, h2, e3, d4, g5, f6, a7, c7, e7 (10)

Гэтая пазіцыя 6х10 з'яўляецца нефарматнай і не адказвае правілам шашачнай кампазіцыі. Можна дадаць дзве шашкі белым і ўскладніць рашэнне на 1 ход, тады пазіцыя стане фарматнай. Легальнасць становішча ў кампазіцыі па шашках-64 даказваць неабавязкова.

№ 43

**Белыя простыя шашкі:** c1, a3, b4, f4, h4, a5, c5, h6 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** d2, f2, h2, c3, e3, d4, g5, f6, a7, e7 (10)

Яшчэ некалькі кампазіцый складзена вядучым аддзела.

№ 44

**Белыя простыя шашкі:** h2, a3, c5, e5, d6 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** g3, f4, g5, g7, f8 (5)

№ 45

**Белыя простыя шашкі:** b2, h2, d4, f4, e5, b6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** d2, g3, h4, f6, a7, e7, g7 (7)

№ 46

**Белыя простыя шашкі:** h2, a3, d4, c5 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** g3, f4, g5, d6, e7, g7 (6)

№ 47

**Белыя простыя шашкі:** c1, d2, f4, h4, g5, d6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, b4, c5, b6, h6, e7, f8 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс: з 8 да 18 красавіка ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках (Мінск, вул. К. Маркса, 10) пройдуць чэмпіянаты Беларусі па шашках-100.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 136. Ад 26.03.21.

№ 37 1.d2-c3? d4:b2 2.a3:c1 c5-b4 ! 3.a5:c3 e5-d4 4.c3:e5 e7-f6 5.g5:e7 f8:h2+

№ 38 1...e5-d4 ад пагрозы 2... f8-g7 3.h6:f8 d6-c5 няма паратунку. + С. Лойка (Украіна) памылкова лічыць, што пасля 4.f8:b4 a5:a1 5.g3-h4 белыя ўцякаюць на нічыю, але 5...dc3 6.db4 ac3+ і тры белыя шашкі адрэзаныя па двайніку, чацвёртая трапляе ў апазіцыю.

№ 39 3, 26, 8, 48, 46(40) 28(45) 50 + чорная простая «35» ліквідуе п/р: 3, 3-21, 16, 46 +

№ 40 1.43-38 5.62/19 — 2.26 32:34 2.09-03 13.84/23 — 5.61 29:38 3.47-42 38:47 4.03-26 47:20 5.26:05 15-20 6.05-32 20-24 7.32-38 +

Першыя дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Лойка (Украіна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

**Віталь ВАРУШЫЛА,**
**майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Медыяпрастора

## «ЗВЯЗДУ» — У КОЖНЫ ДОМ

### Тэлевяшчанне па максімуме: 18 гадзін у суткі, сем дзён на тыдзень

**Наваполацкая рэгіянальная тэлерадыёкампанія «Вектар» была створана яшчэ ў 2000 годзе. Сфарміраваўшы ўласную сетку вяшчання і правёўшы рэбрэндынг, у лістападзе 2019 года яна прадставіла маштабны праект — ваенна-патрыятычны тэлеканал «Звязда». Яго стварэнне прымеркавалі да знакавых юбілейных дат: вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 75-годдзя Вялікай Перамогі. Галоўная місія канала — праўдзіва і дакладна даносіць аўдыторыі факты пра гістарычна важныя і значныя падзеі ХХ стагоддзя. Пра месца рэгіянальнага тэлебачання ў сістэме СМІ краіны, аб праектах і ўнікальнасці транслюемага фармату паразмаўлялі з дырэктарам Наваполацкага кабельнага тэлебачання «Вектар» Аляксандрам АСЕНКАМ.**



***— З моманту стварэння канала вы дастаткова хутка займелі папулярнасць і заваявалі давер гледачоў, аб чым сведчыць уваходжанне ў «топ-20» самых папулярных тэлеканалаў сярод тых, якія транслююцца аператарам электрасувязі «Белтэлекам» (ZALA), а іх прыкладна 200. Асноўны напрамак вяшчання «Звязды» — ваенна-патрыятычны. Чаму сёння так важна прадстаўляць шырокай аўдыторыі менавіта такі кантэнт?***

— Гісторыю ніхто не павінен забываць, гэта наша памяць. Хочам дастукацца да ўсіх сэрцаў, у тым ліку і моладзі. Наша асаблівасць — унікальнае інфармацыйнае напаўненне. Мы паказваем класіку савецкага ваеннага кіно, сучасныя мастацкія фільмы і серыялы, дакументальныя, навукова-папулярныя, публіцыстычныя праграмы пра Вялікую Айчынную вайну, аўтарскія праекты, кадры хронік і архіўныя матэрыялы — усё тое, што аб'ектыўна адлюстроўвае падзеі мінулых гадоў. Канал вяшчае на ўсю краіну 18 гадзін у суткі, сем дзён на тыдзень. Мы адсочваем, што цікава нашым гледачам. Наладзілі добрае ўзаемадзеянне з тэлепраграмай «Зваротны адлік», дзе прыводзяцца малавядомыя гістарычныя факты з жыцця краіны, выпускаем хроніку надзвычайных здарэнняў «Рубікон». Вельмі шчыльна цяпер супрацоўнічаем з «Ваен-ТБ» — тэлекампаніяй Міністэрства абароны, выпускаем у эфір як сацыяльныя ролікі, так і дакументальныя праекты.

Галоўная задача тэлевізійнай каманды — аператыўна і аб'ектыўна паведамляць актуальныя навіны краіны, рэгіёна. Аснову вяшчання тэлеканала складае праграма «Навіны», у эфіры яна з аўторка да пятніцы тры разы на дзень. У выпусках адлюстроўваюцца найважнейшыя сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя працэсы, якія адбываюцца ў Беларусі. Мы не проста інфармуем, але і аналізуем розныя падзеі і факты. З гэтай нагоды кожны панядзелак у эфір выходзіць інфармацыйна-аналітычная праграма «Альтэрнатыва», у рамках якой асвятляем вынікі работы за мінулы тыдзень. На пастаяннай аснове транслюем інтэрактыўны праект «Ёсць пытанне», тэлечасопіс «Тваё здароўе», праграму «Творчая майстэрня», духоўна-асветніцкую перадачу «Лампада». Ёсць і серыйныя праекты, напрыклад «Гістарычны каляндар», «Цана Перамогі», дзе ў 26 серыях адлюстраваны асноўныя падзеі і факты Вялікай Айчыннай вайны.

***— З кім канкурыруе «Звязда»? Якое месца займае ў сістэме рэгіянальных СМІ?***

— Канал быў створаны для таго, каб вывесці рэгіянальнае тэлевяшчанне на новы ўзровень і каб прапанаваць нашым калегам, кабельным аператарам, запатрабаваны кантэнт. Пра цікавасць да яго сёння сведчаць рэйтынгі. За апошні год мы заваявалі давер і ўвагу свайго тэлегледача і падняліся ў рэйтынгу самых папулярных тэлеканалаў, якія транслююцца аператарам электрасувязі «Белтэлекам» (ZALA) са 112-й пазіцыі на 16-е месца. Што датычыцца канкурэнцыі, то лічу: больш карэктна казаць, што з іншымі рэгіянальнымі СМІ мы калегі, з імі цяпер актыўна наладжваем партнёрства.

***— Вы актыўна ведзяце сацыяльныя сеткі...***

— У пэўны момант наша каманда адчула, што тэлебачанне страчвае папулярнасць, актуальнасць у першую чаргу з-за хуткасці атрымання інфармацыі. Несумненна, інтэрнэт усё больш актыўна заваёўвае гледача, канкурэнцыя ўзмацнілася. Для таго каб хацелася ўключыць тэлеканал, яго неабходна напаўняць якасным, разнастайным кантэнтам, арыентаваным на інтарэсы аўдыторыі. Пры гэтым галоўнымі прынцыпамі павінны заставацца аб'ектыўнасць і аператыўнасць інфармацыі. Таму вырашылі актыўна развіваць сацсеткі. Першае, з чаго пачалі, — гэта відэахостынг YouTube. На сёння на канале фіксуецца амаль 9,5 тысячы ўнікальных гледачоў у месяц. Радуе, што, калі выкладваем кантэнт на YouTube-канал, заўсёды ёсць зваротная сувязь, прычым каментарыі неадназначныя, ідзе дыялог паміж карыстальнікамі сеткі, ёсць розныя пункты гледжання, абмен думкамі. Паралельна прысутнічаем і ў іншых сацыяльных сетках: «УКантакце», дзе за месяц бывае амаль 3 тысячы ўнікальных наведвальнікаў і каля 8 тысяч падпісчыкаў; Facebook (колькасць падпісчыкаў прыкладна 1,5 тысячы карыстальнікаў), Instagram, дзе перасягнулі планку ў 6,5 тысячы падпісчыкаў, «Аднакласнікі». У Instagram мы аператыўна размяшчаем навіны з месца падзей, коратка паведамляем самую важную інфармацыю, адначасна анансуючы нашы тэлепраграмы і тэлесюжэты. Ёсць і ўнікальныя праекты, якія ствараліся менавіта для дадзенай сацсеткі і вядуцца толькі там. Напрыклад, праект, створаны сумесна з ДАІ, — «Бяспечная дарога». Цяпер вельмі актыўна развіваецца TikTok, таму ў хуткім часе будзем адаптаваць кантэнт і пад яго.

***— Якія задачы паставілі на бягучы год? Якім бачыце развіццё свайго тэлеканала ў найбліжэйшай будучыні?***

— Хацелася б развіваць дакументалістыку ўласнай вытворчасці і каб журналісты прэзентавалі сябе як асабістыя брэнды, былі ўніверсальнымі спецыялістамі. Каб яны адкрыта выказвалі сваю пазіцыю па розных пытаннях, праблемах. Лічу, што ў нашай прафесіі цяпер трэба быць больш смелымі. Мне вельмі падабаецца, як працуюць калегі з нацыянальных тэлеканалаў, — трэба ісці ў гушчу падзей і паказваць усё самае цікавае і актуальнае. Але інфармацыя павінна быць толькі з афіцыйных крыніц. Да таго ж для нас вельмі важны дыялог з тэлегледачамі, зваротная сувязь з імі ў фармаце праглядаў, каментарыяў, лістоў. Зараз мы запатрабаваныя як СМІ і ўпэўнены, што ў далейшым будзем станавіцца толькі лепшымі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

### Беларусь 1

**6.15 Меладрама «Дзяўчына з вачыма колеру неба» (12+).**
8.05 Клуб рэдактараў (16+).
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
9.35 Гісторыі выратавання (12+).
10.10 «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
10.45 Маршрут пабудаваны (12+).
11.25 Сэнс жыцця (12+).
### EuroSport 1

**0.30** Снукер. FIM Endurance (6+).
**2.30, 8.00, 12.00, 16.30, 23.00** Веласпорт. «Тур Турцыі» (12+).
**4.00, 9.30, 21.00** Снукер. The Players Championship (6+).
**6.00, 19.30** Мотагонкі. FIM Endurance (12+).
**15.00** Веласпорт. «Вуэльта Валенсіі» (12+).
**18.30** Алімпійскія гульні. Карл Льюіс vs. Усэйн Болт (12+).
**19.00** Алімпійскія гульні. Марк Спітц vs. Майкл Фелпс (12+).

### Кінакамедыя

**0.35** Прышэльцы (12+).
**3.15** Муві 43 (18+).
**5.00** Ягуар (16+).
**6.50** Круты і цыпачкі (12+).
**8.45** Колькі ў цябе? (16+)
**10.40** Нянькі (16+).
**12.30** Эйс Вентура-2: калі кліча прырода (12+).
**14.10** Вельмі страшнае кіно-3 (16+).



**15.35** Сябраваць па-рускy! (18+)
**17.30** Нязносныя босы-2 (16+).



**19.30** Кадры (12+).
**21.40** Суперстар (16+).
**23.20** Як выйсці замуж за мільярдэра (18+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.40** «Паглядзім» (12+).
**10.15, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.15, 17.40** «Паралельны свет» (12+).
**12.15, 18.40, 3.05** «Сляпая» (16+).
**13.20, 4.00** «Варажбітка» (12+).
**14.25** «Містычныя гісторыі» (12+).
**15.30** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.05** «Ведзьмакі свету» (16+).
**17.05** «Знакі лёсу» (16+).
**19.50** «Звышнатуральны адбор» (16+).
**20.55** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**22.00** Камедыя «Мы купілі заапарк» (12+).



**0.20** «Асноўны інстынкт-2». Маст. фільм (18+).
**2.20** «90-я» (16+).

### ТБ1000

**5.00, 17.20** Доктар Хаус (16+).
**6.50** Анаконда (16+).
**8.50** Джуманджы (6+).
**10.35** Кінг Конг (16+).
**13.55** Прывідны патруль (12+).
**15.30** Дзень сурка (12+).
**19.00** Скарб Амазонкі (16+).
**20.45** Бібліятэкар: у пошуках дзіды лёсу (16+).
**22.30** Мексіканец (16+).
**0.35** Сакрэты Лос-Анджэлеса (18+).
**2.50** Афера Томаса Краўна (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.55** Гагарын. Першы ў космасе (6+).
**7.55** Час Першых (6+).
**10.25** Чалавек з будучыні (16+).
**11.45** Роба (6+).
**13.20** Населены востраў (12+).
**15.25** Населены востраў: сутычка (12+).
**17.15** Добры хлопчык (12+).
**19.00** Кур'ер з Раю (12+).
**20.40** Дзікая Ліга (12+).
**22.40** Скрынка (12+).
**0.25** Каляфутбола (18+).
**1.55** Прыцягненне (12+).
**3.50** Толькі не яны (16+).

### National Geographic

**6.41** На плытах па Юкане (16+).
**7.31, 13.23, 22.41** Аўта-SOS (16+).
**9.12** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**10.03** Усярэдзіне неверагоднай механікі (16+).
**10.53** Інстынкт выжывання (16+).
**11.44** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**12.31, 15.52, 20.09, 21.50, 1.08** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**14.14, 4.07** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**15.04, 2.39** Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія і Перу (16+).
**17.35** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**18.28** Фабрыка ежы (16+).
**19.17** Панарама 360 градусаў: разбурэнне аб'ектаў сусветнай спадчыны (16+).
**21.00, 3.21** «Амерыканскае зацямненне» (16+).
**0.19** Ліхтугі за мяжой (16+).
**4.52** Асушыць акіян (16+).
**5.37** Навуковыя глупствы (16+).

### Discovery

**8.00, 17.42** Сталёвыя хлопцы (12+).
**8.46, 16.48, 22.12** Махінатары (12+).
**9.39, 20.24, 5.45** Паляўнічыя на старызну (12+).
**10.32, 15.00, 21.18** Як гэта зроблена? (12+)
**11.25** Махінатары: пяцёрка лепшых (12+).
**12.18** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**13.12, 6.30** Залатая ліхаманка (16+).
**14.06, 7.15** Залатая ліхаманка: Берынгава мора (12+).
**15.54, 1.47** Музейныя загадкі (12+).
**18.36, 2.40** Смяротны ўлоў (16+).
**19.30, 4.15** Мяцежны гараж (16+).
**23.06** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**0.00** Аляска: апошні рубеж (16+).
**0.54** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**3.30** НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (12+).
**5.00** Як гэта ўладкавана? (12+)

### Беларусь 1

**6.00, 7.30, 8.30** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.20, 8.20** Навіны эканомікі.
**7.25, 8.25** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10, 0.35 Серыял «След» (16+).**
**10.45** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Меладрама «Ніцая вярба». Закл. серыі (16+).**
**14.00** «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.50, 15.25 Меладрама «Цыганскае шчасце». Закл. серыі (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Сэнс жыцця (12+).
**17.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**18.15** «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў (16+).
**22.40 Меладрама «Закон захавання кахання». 1-я і 2-я серыі (16+).**
**1.35** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 16.30** Тэлебарометр.
**9.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.00** «На нажах» (16+).
**11.00, 18.25 Серыял «Браты па крыві-2» (16+).**
**12.45** «Тры першыя спатканні» (16+).
**13.30** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**14.00, 17.30** «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
**14.55** М/с «Цімон і Пумба» (0+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «ПІН_КОД» (12+).
**16.35 «Клон». Серыял (16+).**
**20.15, 21.15** «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**22.45 Трылер «Каматознікі» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Марынаваны карась.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.20** Навіны культуры.
**8.25, 18.00 «Маргарыта Назарава». Серыял (16+).**
**10.10** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**10.25, 15.40 «Учора скончылася вайна». Серыял (12+) [СЦ].**
**12.20** «Беларуская кухня». Бульбяныя дзедкі.
**12.50** «Сіла веры».
**13.15, 21.05** «Легенды кіно». Сяргей Ніканенка (12+).
**13.50, 21.40 «Сямнаццаць імгненняў вясны». Серыял (12+) [СЦ].**
**15.00** «1418 дзён. Гісторыя Перамогі». Фільм чацвёрты «Вызваліцелі», заключны (12+).
**17.20** «Гісторыя Беларусі. Бітвы». Бярэзіна, 1812.
**17.45** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**19.55** «Арт-гісторыі». Знакаміты і невядомы Мікалай Казак [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** «Артэфакты». Унікальны ўзор ручнога ткацтва — кунтушовы пояс слуцкага тыпу [СЦ].

### Беларусь 5

**7.00, 23.25** Тэніс. WTA. Чарльстон.
**9.05, 11.05, 14.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Чвэрцьфінал. Матч у адказ.
**11.35** Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. Фінал. Другі матч.
**13.45** Фактар сілы.
**16.20** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**16.55** Вось гэта спорт!
**17.15** Авертайм.
**17.50** Спорт-цэнтр.
**18.00, 22.40** Дзюдо. Чэмпіянат Еўропы. Фіналы.
**19.00** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Енісей» (Красноярск). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.40** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. Пяты тур. ФК «Віцебск» — ФК «Слуцк». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.50** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 0.05 Серыял «Двайное жыццё» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Трывожная кнопка» (16+).
**16.45, 18.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**18.50** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Голас. Дзеці». Новы сезон (0+).
**22.45** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Вясновая серыя гульняў (16+).

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.10** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.25, 20.45, 0.50** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50 «Пасажыр без багажу». Серыял (16+).**
**20.15, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».

### МІР

**5.00 Серыял «Дэсант ёсць дэсант» (16+).**
**7.15, 10.20 Серыял «Меч» [СЦ] (16+).**
**10.00,13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «У гасцях у лічбы» (12+).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+).
**14.10, 16.20** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.00 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў» [СЦ] (16+).**
**19.15** Ток-шоу «Слабае звяно» (12+).
**20.15** «Гульня ў кіно». (12+).
**21.00** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**21.40 Маст. фільм «Кітайскі сервіз» [СЦ] (16+).**
**23.40** «Начны экспрэс». Варвара Візбар (12+).
**0.55 Маст. фільм «Кур'ер» (16+).**
**2.15 Маст. фільм «Свінарка і пастух» [СЦ] (12+).**
**3.40** Мультфільмы (0+).
**4.35 Маст. фільм «Каменная кветка» [СЦ] (6+).**

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35 Маст. фільм «Вось гэта каханне!» (12+)**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40** «Блізкія людзі».
**16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05, 23.10** «Гумарына» (16+).
**23.45 Маст. фільм «Маё чужое дзіця» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.20, 16.20, 19.35, 22.05, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.15** Спорт-мікс.
**6.25** «Беларусы» (6+).
**7.15** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30** Сфера інтарэсаў.
**8.55** Навукаманія «(6+).
**9.25, 22.10** «НЗ.by».
**9.50, 10.20 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**11.05, 13.45 Баявік «Непаможны» (16+).**
**13.20** Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**19.50 Серыял «Рэалізацыя» (16+).**
**22.35, 23.45 Фільм «Малады» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.45, 19.50, 21.00, 1.45** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** «Мультпарад». «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).
**7.30, 15.50, 20.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).**
**8.20, 18.50 Серыял «Дзеля усяго чалавецтва» (12+).**
**9.25, 19.55 Серыял «У Сусвеце» (16+).**
**10.15** Дак. фільм «Таямніцы космасу». Гонка за НЛА (12+).
**11.00 Трылер «Прыбыццё» (16+).**
**13.00 Серыял «Лейтэнант Каломба» (12+).**
**14.15 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).**
**15.55** «Мультпарад» (0+).
**16.25** «Гатуй як шэф» (12+).
**16.40 Серыял «Прынцэса-недатыка» (12+).**
**20.50** «Вечарніца» (6+).
**21.05 Камедыя «Каханне і монстры» (12+).**
**22.55 Драма «Інтэрстэлар» (12+).**



### ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00, 14.20** «Раніца з гумарам» (16+).
**10.45, 21.30** «Уральскія пельмені». Азбука Уральскіх пельменяў — Б (16+).
**12.20** «Лаві момант» (16+).
**13.15, 2.55** Серыял «Вароніны» (12+).
**16.20, 2.00** Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
**17.25** «Галілеа» (12+).
**18.30** Серыял «Кухня. Вайна за атэль» (16+).
**20.30** Серыял «Радкам» (16+).
**23.00** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**0.00** Серыял «90-я. Весела і моцна» (16+).
**1.00** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**3.50** «Адна за ўсіх» (16+).
**4.45** «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква Высоцкага.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35** Колер часу.
**7.45, 18.40** «Аляксандр Македонскі. Шлях да улады». Дак. фільм [СЦ].
**8.35** «Бераг яго жыцця». Маст. фільм.
**9.45** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.30** ХХ стагоддзе. «Шчаслівы лёс Расціслава Плята». Вядучы Віталій Вульф. 1993.
**12.05** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**12.20** Штучны адбор.
**13.00** «Мікалай Пятроў. Партытура шчасця». Дак. фільм.
**13.40, 22.10** «Віктор Гюго. Вораг дзяржавы». Серыял.
**14.30** «Касмічная адысея. XXI стагоддзе». Дак. серыял [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Кіно.
**15.20** «Біблейскі сюжэт».
**15.45** «Белая студыя».
**16.30, 23.50** «Наша кіно. Чужыя берагі». Дак. серыял [СЦ].
**17.10, 23.00** «Маналог у 4 частках. Сяргей Ніканенка». Частка 2-я [СЦ].
**17.40, 1.25** Гістарычныя канцэрты. Піяністы ХХ стагоддзя.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Успамінаючы Валянціна Курбатава. «Неспадзяваны партрэт». Дак. серыял [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малышы!»
**20.45** Абсалютны слых.
**21.30** Улада факта.
**2.30** Раман у камені. «Растоў-на-Доне. Асабнякі Парамонавых». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія»: «Вайсковыя байкі» (18+).
**7.05, 9.40, 11.00, 13.00, 15.40, 17.00, 20.10, 21.40, 23.00, 1.00, 2.45, 3.40** Музычная настальгія (12+).
**7.20, 13.15** Тэлеспектакль «Кузен Понс» (16+).
**8.15, 14.10** Фільм-канцэрт «Зімовы вечар... у Лужніках!» (12+)
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час»: «У рэстаране музыка іграла» (18+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**19.00** Маст. фільм «Прэм'ера ў Сасноўцы» (16+).
**0.00** «Народжаныя ў СССР». Лепшае (12+).
**1.10** «Вакол смеху». 1981 год (12+).
**4.00** Тэлеспектакль «Ноч памылак» (16+).

### EuroSport 1

**0.30** Аўтагонкі. Формула Е (12+).
**1.30** Мотагонкі. «24 гадзіны Ле-Мана» — 2019 (12+).
**2.30, 8.00, 12.00, 18.30, 23.10** Веласпорт. «Тур Турцыі» (12+).
**4.00, 9.30** Снукер. German Masters (6+).
**6.00** Мотагонкі. «Боль д'Ор» — 2019 (12+).
**15.00, 19.15** Веласпорт. «Вуэльта Валенсіі».
**16.30** Веласпорт. «Флэш Брабансон».
**20.00** Гольф. «Мастэрс» (6+).
**21.00** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс Big in Japan (12+).
**22.00** Алімпійскія гульні. Карл Льюіс vs. Усэйн Болт (12+).
**22.30** Алімпійскія гульні. Марк Спітц vs. Майкл Фелпс (12+).

### Кінакамедыя

**0.35** Ні хвіліны супакою (12+).
***2.00 Прафілактыка на тэлеканале.***
**10.15** Прышэльцы (12+).
**12.15** Прышэльцы-2: калідоры часу (12+).



**14.30** Вельмі страшнае кіно (16+).
**16.05** Ягуар (16+).
**17.55** Мужчына па выкліку-2 (16+).
**19.30** Эйс Вентура: вышук хатніх жывёл (12+).
**21.05** Эйс Вентура-2: калі кліча прырода (12+).
**22.45** З рэчамі на вылет! (16+)

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.45** «Перыскоп» (16+).
**10.05, 16.00, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.05, 17.40, 3.40** «Паралельны свет» (12+).
**12.05, 18.40,** «Сляпая» (16+).
**13.15, 19.50** «Варажбітка» (12+).
**14.25, 2.55** «Містычныя гісторыі» (12+).
**15.25** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**17.05** «Знакі лёсу» (16+).
**21.00** «Следства па целе». Серыял (16+).
**22.50** «Грым». Серыял (16+).
**23.45** «Глядзі сам» (16+).
**0.00** «10 самых» (16+).
**0.35** «Лінія абароны» (16+).
**1.10** «Чорны лебедзь». Маст. фільм (16+).

### ТБ1000

**5.10, 17.20** Доктар Хаус (16+).
**6.35** Афера Томаса Краўна (16+).
**8.30** Рабаванне па-італьянску (12+).
**10.25** Белфегор — прывід Луўра (12+).
**12.05** Зялёная міля (16+).
**15.30** Якія не спяць у Сіэтле (6+).
**19.00, 3.35** Маёр Пэйн (12+).
**20.40** Жарты ў бок-2: Місія ў Маямі (16+).
**22.40** Без тармазоў (16+).
**0.15** Паляўнічыя на прывідаў (12+).
**1.55** Паляўнічыя на прывідаў-2 (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Карлік Нос (6+).
**7.00** Прыцягненне (12+).
**9.05** Спадарожнік (16+).
**11.00** Ласкавы май (16+).
**13.05, 19.10** Паляўнічыя на брыльянты. Серыял (16+).
**15.10** Высоцкі. Дзякуй, што жывы (16+).
**17.35** Напарнік (12+).
**21.10** Брамнік Галактыкі (6+).
**23.15** Абаронцы (12+).
**0.50** Каляфутбола (18+).
**2.20** Цой (16+).
**4.15** Лёгкі на ўспамін (12+).

### National Geographic

**6.34** Золата Юкана (16+).
**7.23, 12.28, 16.43, 22.42, 1.56** Аўта-SOS (16+).
**9.05** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**9.56** Інжынерныя ідэі (16+).
**10.50** Інстынкт выжывання (16+).
**11.41** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**14.11, 4.17** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**15.03, 2.42** Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія і Перу (16+).
**15.52, 20.09, 21.51, 0.25** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**17.34** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**18.28** Фабрыка ежы (16+).
**19.17** Панарама 360 градусаў: разбурэнне аб'ектаў сусветнай спадчыны (16+).
**21.0, 3.26** Аляска: новае пакаленне (16+).
**23.33** Ліхтугі за мяжой (16+).
**5.04** Асушыць акіян (16+).
**5.39** Навуковыя глупствы (16+).

### Discovery

**8.00, 17.42** Сталёвыя хлопцы (12+).
**8.46, 16.48, 22.12** Махінатары (12+).
**9.39, 20.24, 5.45** Паляўнічыя на старызну (12+).
**10.32, 15.00, 21.18** Як гэта зроблена? (12+)
**11.25** Махінатары: пяцёрка лепшых (12+).
**12.18, 7.15** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**14.06, 0.00** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**15.54, 1.47** Музейныя загадкі (12+).
**18.36, 2.40** Смяротны ўлоў (16+).
**19.30, 4.15** Мяцежны гараж (16+).
**23.06** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**3.30** НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (12+).
**5.00** Як гэта ўладкавана? (12+)
**6.30** Штаб-кватэры Гітлера (16+).

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

# ФОРМУЛЫ ПАСПЯХОВАГА БІЗНЕСУ ВЫВУЧАЮЦЬ ДЭПУТАТЫ

**Як падтрымліваюць развіццё бізнесу ў Гомельскім раёне, прааналізавалі старшыні Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню Гомельскай вобласці. Яны бралі ўдзел у абласным семінары, прысвечаным ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў садзейнічанні прадпрымальніцкай актыўнасці.**



Зараз Гомельскі раён займае шостае месца ў рэгіёне па колькасці арганізацый малога і сярэдняга бізнесу, прычым колькасць прыватных прадпрыемстваў стабільна расце. У пачатку семінара **старшыня Гомельскага райвыканкама Сяргей ЕРМАЛІЦКІ** расказаў аб асноўных паказчыках сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна. Ён звярнуў увагу на прывабнасць тэрыторыі каля абласнога цэнтра для прадстаўнікоў бізнесу. Сярод плюсоў — спрыяльная падатковая палітыка, магчымасць атрымання ва ўласнасць або арэнду аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія не выкарыстоўваюцца. Росту колькасці арганізацый малога і сярэдняга бізнесу ў Гомельскім раёне садзейнічае і зручнае месцазнаходжанне, якое гарантуе шырокі рынак збыту.

— У даходнай частцы бюджэту раёна 47 % складалі адлічэнні ад прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу ў выглядзе падатковых і непадатковых плацяжоў. У грашовым выражэнні — звыш 50 мільёнаў рублёў, і гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у рэгіёне, — адзначыў старшыня Гомельскага райвыканкама Сяргей Ермаліцкі.

Удзельнікі семінара наведалі дрэваапрацоўчы цэх Гомельскага даследчага лясгаса, што размешчаны ў пасёлку Калініна Цярэшкавіцкага сельскага Савета. Работнікі гэтага прадпрыемства, дарэчы, атрымліваюць адну з самых высокіх сярод лясгасаў вобласці і краіны заработную плату. **Дырэктар, дэпутат абласнога Савета Ігар ДЗЯГЦЯРЫК** расказаў пра тое, як мадэрнізацыя прадпрыемства дапамагае павялічваць даходы і забяспечваць стабільны рост паставак прадукцыі на экспарт. Сёлета на прадпрыемстве плануюць увесці ў дзеянне новы перспектыўны аб'ект — завод па вытворчасці пелет.

На тэрыторыі Бабовіцкага сельсавета ўдзельнікі семінара азнаёміліся з дзейнасцю цэнтра экалагічнага турызму «Беладжыё». Тут **дырэктар таварыства з абмежаванай адказнасцю «Сэрвіс-Альянс» Васіль АНТОНАЎ** здолеў стварыць унікальны турыстычны аб'ект з шырокім спектрам паслуг. Гэта прыклад таго, як прыватная ініцыятыва стала паспяховым праектам па стварэнні прывабнага месца для сямейнага адпачынку. На тэрыторыі — альтанкі і пірсы над воднай роўнядззю, домік для адпачынку, дзіцячы гарадок. Брэнд аграсядзібы — міні-заапарк пад адкрытым небам, дзе жыве больш за 30 відаў жывёл, у тым ліку зубры.

— «Беладжыё» не толькі прымае турыстаў, але і эфектыўна супрацоўнічае з рознымі арганізацыямі і службамі раёна, выдзяляе пляцоўкі для правядзення адукацыйных мерапрыемстваў для дзяцей і моладзі, — звярнула ўвагу **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА.**

Удзельнікі семінара наведалі таксама Улукаўскі сельсавет. Тут яны азнаёміліся з работай прыватных прадпрыемстваў — вытворчая кампанія «Сябры» і кандытарская фабрыка «Летож». Гэтыя вытворчасці ўносяць значны ўклад у пашырэнне рынкаў экспарту, забяспечваюць развіццё вытворчасці і стварэнне новых рабочых месцаў, адзначыла старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў. Кіраўнік дэпутацкага корпуса раёна звярнула ўвагу на тое, што супрацоўнікі гэтых прадпрыемстваў аказваюць актыўную падтрымку ў добраўпарадкаванні тэрыторыі, выступаюць «шэфамі» ўстаноў адукацыі, дапамагаюць у рабоце з ветэранамі. Кандытарская фабрыка «Летож» нярэдка аказвае і спонсарскую дапамогу ўстановам, якія знаходзяцца на тэрыторыі Улукаўскага сельсавета, рэгулярна дасылае салодкія падарункі для дзяцей Улукаўскай дапаможнай школы-інтэрната.

Па выніках удзелу ў семінары старшыні Саветаў дэпутатаў дзяліліся ідэямі праектаў, якія можна эфектыўна ўкараніць у сваіх раёнах, скарыстаць асаблівасці і патэнцыял тэрыторый.

— Мы пераканаліся, што вельмі многае залежыць ад узаемадзеяння бізнесу з рознымі галінамі ўлады, — адзначыла **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЯНКЕВІЧ.** — Прадстаўнікі дэпутацкага корпуса бліжэй за ўсё да людзей, ведаюць іх надзённыя праблемы, таму і ў пытаннях, звязаных з прадпрымальніцтвам, дэпутатам пад сілу вырашыць многае. Кацярына Анатольеўна акцэнтавала ўвагу старшынь Саветаў дэпутатаў на рэалізацыю рэгіянальнага комплексу мерапрыемстваў дзяржпраграмы «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва» на 2021—2025 гады. За пяцігодку ў рэгіёне плануюць рэалізаваць у кожным раёне вобласці значныя інвестпраекты ў сферы вытворчасці. Сёлета на Гомельшчыне запланавана стварыць 530 арганізацый, з якіх 145 — у вытворчай сферы і 385 — у сферы паслуг.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# Бюджэт, ахова здароўя, «квадраты» і ЖКГ...

**На пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў былі зацверджаны рэгіянальныя комплексы мерапрыемстваў каля дзесяці дзяржаўных праграм. І яны без перабольшвання датычацца ўсіх жыхароў паўночнай вобласці Беларусі.**

Але ў пачатку заслухалі справаздачу аб выкананні абласнога бюджэту за 2020 год. Як адзначыў **начальнік галоўнага фінансавага ўпраўлення аблвыканкама Генадзь ГРЭБНЕЎ,** аб'ём уласных падатковых і непадатковых даходаў кансалідаванага бюджэту летась склаў парадку 1,5 мільярда рублёў — на 4 % больш у параўнанні з пазамінулым годам. Па выніках года ўдалося дасягнуць збалансаванага выканання бюджэту вобласці, памер яго дэфіцыту адпавядае патрабаванням адпаведнага заканадаўства. Датацыйнасць кансалідаванага бюджэту захавалася на зацверджаным узроўні...

Летась выдаткі былі на ўзроўні 2,6 мільярда рублёў — на 10 % больш, чым у 2019-м (гэта стала магчымым у асноўным у выніку фінансавай падтрымкі з бюджэту рэспубліканскага ўзроўню). Прыблізна 66 % грошай накіравалі на тое, каб фінансаваць сацыяльна-культурную сферу.

Акрамя таго, зрабілі многае, каб падчас пандэміі падтрымаць тых, хто на перадавой. Некаторыя лічбы сведчаць самі за сабе. Напрыклад, 73 мільёны рублёў за 2020 год выплацілі ў якасці надбавак медыкам, работнікам сацыяльнай абароны.

Пры тым, што ўлада павінна была грашыма рэагаваць на выклікі часу, не панізілі фінансаванне эвалюцыйных праграм, пра якія ведаюць далёка за межамі краіны. У прыватнасці, па-ранейшаму шмат робіцца для «перазагрузкі» Аршаншчыны, паскоранага развіцця гарадоў з насельніцтвам больш за 80 тысяч чалавек, пасёлкаў.

**Старшыня «абласнога парламента» Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** дарэчы народным выбраннікам распавесці даступнай моваў землякам пра бюджэт: куды накіроўваюцца грошы. Каб выбаршчыкі наогул былі ў курсе, у якім стане «кашалёк вобласці»...

Што датычыцца вырашэння жыллёвага будаўніцтва, асабліва ўважліва абмяркоўвалі забеспячэнне квадратнымі метрамі шматдзетных сямей. 3 64 тысяч грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, каля 3 тысяч — з ліку такіх. Уладзімір Цярэнцьеў пацікавіўся, як хутка вырашыцца жыллёвае пытанне для мнагадзетных. Як высветлілася, на працягу года на Віцебшчыне здольны ўручыць ключы навасёлам з трыма і больш дзеткамі. Такім чынам, праблем няма.

Узнімалася і тэма электрадамоў. Калі летась у вобласці трэба было пабудаваць парадку 11 тысяч «квадратаў» такога жылля, сёлета — прыкладна ў 2,2 раза больш.

Пытанні ЖКГ — на асаблівым кантролі. Дэпутаты добра разумеюць, што выбаршчыкі чакаюць, каб якасць паслуг была на найвышэйшым узроўні, улічваючы і падаражанне. Людзі хочуць, каб работнікі сістэмы былі ветлівымі і стараліся як мага аператыўна прыбыць у выпадку, калі ў жыллі камунальныя праблемы.

У цэнтры ўвагі па-ранейшаму — забеспячэнне якаснай вадой населеных пунктаў.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага аблвыканкама Юрый ДЗЯДЗЁЛА** падкрэсліў, што падчас пяцігодкі насельніцтва Віцебшчыны неабходна на 100 % забяспечыць чыстай вадой. За мінулую пяцігодку паказчык падачы вады ў жыллё нарматыўнай якасці здолелі давесці да больш чым 96 %.

Там, дзе жывуць 100 і больш чалавек, неабходна ўсталёўваць станцыі абезжалезвання, а ў маленькіх вёсачках магчыма выкарыстанне індывідуальных сістэм ачысткі вады.

Старшыня аблсавета Уладзімір Цярэнцьеў анансаваў сваю справаздачу ў хуткім часе. Аб тым, што зроблена, найбольш важных праблемах, а таксама якія пытанні дэпутатам неабходна падцягнуць на новы ўзровень, аб планах мы абавязкова раскажам на старонках «МС».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Стратэгія і тактыка

**Нядаўна на сесіі абласнога Савета дэпутатаў зацвердзілі рэгіянальны комплекс мерапрыемстваў па рэалізацыі ў 2021—2025 гадах Дзяржаўнай праграмы «Аграрны бізнес». З мясцовай казны дзеля гэтага запланавана вылучэнне больш за 755 мільёнаў рублёў. А каб абнавіць парк сельскагаспадарчай тэхнікі і агрэгатаў, запланавана з розных крыніц фінансавання выдаткаваць каля 1,6 мільярда рублёў.**

Калі абмяркоўваўся праект рашэння, дэпутаты пачулі ад **старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама Сяргея ЯГОРАВА** важныя лічбы і факты. Галоўныя мэты — павысіць канкурэнтаздольнасць і якасць прадукцыі, павялічыць экспарт. У шасці падпраграмах абгрунтавана расказваецца, як сказалі б ваенныя, «пра стратэгію і тактыку».

Напрыклад, для Віцебшчыны вельмі важная тэма меліярацыйная. Гаспадаркі апрацоўваюць прыблізна 500 тысяч гектараў асушаных зямель — а гэта вельмі многа: каля 40 % ад усіх зямель сельскагаспадарчага прызначэння. Прадугледжваецца фінансаванне работ і сістэмны падыход, каб меліярацыя прыносіла максімум карысці. Пры гэтым магчыма эканомія дзякуючы таму, што летась усе сістэмы меліярацыі перадалі на баланс спецыялізаванаму холдынгу. Вядома, што ў аднаго гаспадара парадку будзе значна больш.

Шмат увагі будзе аддадзена і сортаабнаўленню. За пяць гадоў запланавана давесці рэалізацыю насення вышэйшых рэпрадукцый да 7 тысяч тон. Менавіта столькі і трэба для пасеву на палях Прыдзвінскага краю.

Сярод амбіцыйных мэт — выхад да 2025 года да ўзроўню гадавога ўраджаю збожжавых каля 1,5 мільёна тон. Пра магчымасць гэтага гаварылі даўно. І вось агучаны канкрэтны тэрмін.

А ў выніку таго, што будзе павялічана колькасць галоў племянных жывёл, разам з ажыццяўленнем іншых мер за пяцігодку індэкс вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі дасягне 126 %.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ВОСЬ ТАК У БАБРУЙСКУ ВЫХОЎВАЮЦЬ САПРАЎДНЫХ ПАТРЫЁТАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

**Аляксандр СТУДНЕЎ, старшыня Бабруйскага гарвыканкама:**

— Мы ствараем усе ўмовы, каб вырасціць сапраўдных патрыётаў нашай краіны: разумных, моцных, творчых, якія любяць сваю Радзіму. Летась педагогамі і навучэнцамі ўстаноў адукацыі ў розных конкурсах, турнірах і алімпіядах заваявана больш чым 900 дыпломаў абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў сталі восем бабруйчан. Падчас цэнтралізаванага тэсціравання бабруйскія школьнікі атрымалі пяць 100-бальных сертыфікатаў па беларускай і англійскай мовах, грамадазнаўстве і гісторыі Беларусі. На заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды навучэнцы горада заваявалі чатыры дыпломы — 45 % ад агульнай колькасці. Другі год у школах і гімназіях паспяхова рэалізоўваецца інфармацыйна-адукацыйны праект «Школа актыўнага грамадзяніна». Ва ўстановах адукацыі сфарміравана больш чым 250 дзіцячых маладзёжных аб'яднанняў з агульнай колькасцю звыш 20 тысяч падлеткаў. Актывісты маладзёжнага руху — штогадовыя пераможцы конкурсаў рознага ўзроўню, у тым ліку такіх прэстыжных у краіне, як «100 ідэй для Беларусі», «Junior Skills Belarus». У горадзе існуе болей чым 20 устаноў адукацыі, дзе каля 60 % навучэнцаў вывучаюць асобныя прадметы на павышаным узроўні. На базе 12 устаноў адукацыі, у тым ліку дашкольных, рэалізоўваюцца інавацыйныя і эксперыментальныя праекты. Адкрыты 12 класаў прафесійнай накіраванасці: 4 педагагічныя і 8 па атрыманні спецыяльнасцяў па гарантаванні нацбяспекі краіны і іншых. Для 45 % школьнікаў арганізавана вывучэнне працоўнага навучання па праграме прафесійнай падрыхтоўкі рабочых.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ПРАЙСЦІ ПРАЗ ВЫПРАБАВАННІ І НЕ СТРАЦІЦЬ ЦІКАВАСЦЬ ДА ЖЫЦЦЯ

## Кіраўнікі мясцовай улады павіншавалі з 90-годдзем жыхарку аддаленай вёскі



Старшыня сельскага Савета Анатоль МАРЧУК і Аляксандра МАКУШЫК.

**Аляксандра Дзям'янаўна Макушык надзвычай рада гасцям. Нас, старшыню райсавета і сенатара Анатоля Шалтанюка, кіраўніка сельвыканкама Анатоля Марчука, а таксама карэспандэнта, запрашае ў хату, стараецца пасадзіць як найлепш. Але перад пачаткам гутаркі мерае ціск, выпівае свае таблеткі: тахікардыя, іншыя праблемы нагадваюць аб сабе нават пры самым нязначным хваляванні. Не так даўно шаноўны ветэран сельскай адукацыі адзначыла 90 гадоў.**

### Раней кукавала, а цяпер свішчы!

— Ніколі не думала, што дажыву да такіх гадоў, а вось бачыце, які доўгі век Бог адмераў, — пачынае гаворку гаспадыня і дастае свае альбомы са здымкамі, скарбонкі з дакументамі, папкі з памятнымі і важнымі рэчамі. І сама вырашае, што лепш расказваць па парадку, з самага дзяцінства.

Нарадзілася яна ў вёсцы Харкі суседняга Пружанскага раёна. Вёска асаблівая тым, што побач праходзіць чыгунка. Колькі сябе памятае, праводзіла цягнікі: бацька ж працаваў на дарозе. Думала спачатку звязаць сваё жыццё з чыгункай. Але потым усё ў сям'і памянялася, у 1949 годзе бацька захварэў і памёр. Яна толькі скончыла сямігодку, ехаць вучыцца далёка не выпадала, а ў Пружанах у той час было педвучылішча. Ну і пайшла паступаць, у прамым сэнсе пайшла. Па тым часе 25 кіламетраў — не адлегласць, а грамадскі транспарт не хадзіў. Кожны тыдзень у суботу пасля заняткаў прыходзіла дадому, каб дапамагчы маці, а ў нядзелю вечарам зноў кіравала ў Пружаны. Так і вучылася чатыры гады.

У гэты час давялося асвоіць яшчэ адну навуку — касьбу. Маці трымала карову. Дачка за лета накошвала сена. «Тут у нас у ваколіцах Гарадзечна век балота было, а касіць для сваёй жывёлы можна было толькі на няўдобіцах, — успамінае Аляксандра Дзям'янаўна. — Вось мы з мамай і выбіраліся зранку на балота. Я касіла, яна выносіла траву на грудок, там сушылі, складалі ў копы. А вывозіць можна было толькі ўзімку, калі падмарозіць. Карова была патрэбная: яна карміла сям'ю».

У 1953-м юная Аляксандра скончыла вучобу, атрымала першае ў сваім жыцці накіраванне на работу, у Жабінкаўскі раён. І зноў згадвае: «Прыехала ў Жабінку: вёска-вёскай, адны драўляныя хаты — не тое што ў нас, у Пружанах. Думаю: і што гэта за райцэнтр? Але знайшла аддзел адукацыі, ён якраз каля вакзала размяшчаўся, прад'явіла дакументы. Інспектар з гумарам аказаўся, накіраваў мяне ў школу з такім наказам: «Раней кукавала, а цяпер свішчы!» У мяне прозвішча было Зазуля. А школа, што стала першым месцам работы, была ў вёсцы Свішчы».

### Работа і дом

Калектыў Свішчоўскай сямігодкі яна згадвае з асаблівай цеплынёй, лічыць, што пашанцавала: і падбадзёрваць, і падтрымаюць маладую настаўніцу. А яна зразумела, што знайшла справу па душы, вельмі радавалася кожнаму вучню, які на яе ўроках навучыўся чытаць, прыгожа пісаць, лічыць. «Вучні вясковыя былі тады сціплыя, паслухмяныя. Настаўніка ж на сяле асабліва паважалі, — заўважае суразмоўніца. — На работу ішла з жаданнем, з настроем». Потым яна працавала крыху ў Мацэсах, праз год перавялі ў Глыбокае, якое і стала лёсам.

У Глыбоцкай пачатковай школе працавалі нейкі час усяго дзве настаўніцы — яна і калега. «Я была вельмі энергічная, усё старалася зрабіць і арганізаваць для школы: і агароджу пафарбаваць, і печ адрамантаваць, каб добра грэла. Потым мы пасадзілі агарод, каб была свая прадукцыя для вучняў на сняданак. А яшчэ выпускалі сценгазеты, ладзілі канцэрты, праводзілі гутаркі і лекцыі — адным словам, цікава жылі».

Тут яна і сустрэла свайго Яўгена Макушыка. З ім пабраліся шлюбам. Сталі ўзводзіць дом.

— Бедныя былі, дапамогі — ніякай: у мяне — адна маці, у яго — мачаха і многа дзяцей у сям'і. Купілі старую хаціну, перавезлі, астатняе ўсё куплялі паступова. Зарплата на той час у мяне, памятаю, 40 рублёў была. Атрымаеш грошы: за адзін месяц купіш вокны, за другі — дзверы, і зноў чакаць трэба. Ды неяк хату агаралі, і жыць стала лягчэй. Памятаю, як шафу першую купляла — дык сваёй зарплаты не хапіла, у калегі пазычыла. Але ж мэблю займела — радасці было! Во і цяпер тая шафа стаіць — на мой век яе хопіць. А потым з маім Жэнем патроху разжыліся, кароўку купілі, гаспадарку сваю завялі. Дзеці нарадзіліся: спачатку — Саша, потым — Тамара.

### Выпрабаванні

Усё было добра ў сям'і настаўніцы, але ў 1978 годзе трагічна загінуў сын. Яна той дзень як сёння памятае. У вёсцы праводзілі ў армію аднаго хлопца — тады гэтую падзею адзначалі, ладзілі вечар. І не сказаць, каб ён блізкім сябрам быў прызыўніка, але запрасілі. Расказвае: «Як чула маё сэрца: чамусьці не хацела, каб Саша ішоў, але ж прычын не было і адмовіцца. Я толькі курткy новую сыну купіла... Яны там пасядзелі за сталом, выйшлі, і некалькі хлопцаў, у тым ліку Саша, узяліся правесці прызыўніка да Жабінкі. А Саша вярнуўся дадому па тую куртку, бо пайшоў на вечар без верхняга адзення. Потым, відаць, даганяў кампанію падбегам, сцямнела ўжо. Машына ішла насустрач, кіроўца не заўважыў чалавека на вясковай вуліцы...»

А праз чатыры гады яна пахавала мужа — таксама загінуў у выніку няшчаснага выпадку. Потым давялося забраць да сябе хворую маці. На пенсію пайшла па выслузе: школу ў вёсцы закрылі, а хадзіць у Крыўляны было далёка. Потым, праўда, яшчэ дзесяць гадоў працавала ў калгасе... Гора і слёз хапіла за век гэтай жанчыне. Але яна не страціла дабрыні і спагады, цікавасці да жыцця. Зараз Аляксандра Дзям'янаўна жыве адна. Дачка Тамара, унук — у горадзе. Яны часта праведваюць, дапамагаюць, але ж выбіраюцца ў выхадныя. А на тыдні да яе заходзіць сацыяльны работнік Галіна Ундзірук.

### Кнігі, газеты, каты

— Яна і пагаворыць, і кніжкі прынясе з бібліятэкі, дроў мне, вады наносіць. Першая памочніца, адным словам. А нядаўна вечарам, мусіць, тэлевізар гучна ішоў ці задрамала я, але тэлефон не пачула, як дачка званіла. Ужо сцямнела, чую стук у акно, пытаю, хто там. Аказалася, мая Тамара занепакоілася, што я не адказваю, набрала Галю — тая і прыбегла. Даводзілася ўсіх супакойваць, расказваць, што я жывая, нічога асаблівага не здарылася, — з усмешкай згадвае нядаўнюю гісторыю пенсіянерка.

Аляксандра Дзям'янаўна глядзіць тэлевізар. Прызналася, што любіць асобныя ток-шоу. Выпісвае газету, чытае кнігі — і свае, і з бібліятэкі. Яшчэ некалькі гадоў таму трымала нават казу. Цяпер ужо з гаспадаркі ў яе засталася адна шэрая кошка. «Сабачка быў такі добры, — згадвае гаспадыня, — пражыў 18 гадоў, а цяпер яго няма. Так шкадую. А гэта во кацянятка прыбілася. Я яго сагрэла, адкарміла. Вырасла такая ласкавая кошачка. Ды на табе, бяда: летась пад машыну трапіла, скіВіцу ёй раструшчыла. Пазваніла, унук Вадзім прыехаў адразу, завёз яе ў лячэбніцу, там зрабілі аперацыю — выратавалі маю гаротніцу. Суседкі потым здзіўляліся, як гэта я 60 рублёў за аперацыю не пашкадавала. А я сказала: каб і больш — заплаціла б: гэта ж жывая істота, мы з ёй сябруем».

### Даўжынёй у вуліцу

А суседак, паводле яе слоў, засталося мала: адну сын на зіму гэтым разам забраў, яшчэ дзве, якім пад дзевяноста, рэдка выбіраюцца з хаты. Людзей і наогул нямнога засталося. Гэта некалі Глыбокае — вёска ў адну вуліцу больш за два кіламетры — было вялікім, шумным. Напрыклад, паводле звестак 1970 года, тут пражывала 365 чалавек, у 1998 годзе яшчэ больш за сотню жыхароў налічвалася, а потым колькасць насельніцтва хутка пайшла на спад... Як ужо сказана, была свая школа, працавала ўчастковая бальніца. Некалі нават сельскі Савет функцыянаваў у Глыбокім, і калгас быў свой. Потым, пачынаючы з 70-х, засталася вытворчая брыгада з фермай, паляводчым участкам, дзе працавала нямала людзей. Быў і клуб з бібліятэкай. Зараз нічога не засталося. Цяпер тры разы на тыдзень прыязджае аўтакрама, па графіку — паштовая машына. Абсалютная большасць людзей — пенсіянеры, некаторыя даволі сталага веку.

Аляксандру Макушык цёпла павіншавалі з юбілеем родныя, вучні, мясцовая ўлада. Яна не адзначала сваё 90-годдзе з-за эпідэмічнай абстаноўкі, сямейнае святкаванне вырашыла перанесці на лета. Тых, хто не забыўся пра яе асабістае свята і вырашыў праведаць, прымала з радасцю.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*Жабінкаўскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

**www.zviazda.by**

**e-mail: info@zviazda.by**

**(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 8 красавіка 2021 года.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16** |
| **Предмет аукциона<br>Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16** | |
| **Лот № 1** | |
| **Производственная база** в составе: производ. корпус (1130,5 кв. м, 500/С-49698; 4340,5 кв. м, 500/С-53224), диспетчерская (54,7 кв. м, 500/С-53818), здание специализир. иного назначения (литейный цех) (7664,8 кв. м, 500/С-47329), компрессорная (473,6 кв. м, 500/С-54017), электропечь термическая (39,8 кв. м, 500/С-54018), здание весовой (24,3 кв. м, 500/С-54019), административно-хоз. корпус (2323,4 кв. м, 500/С-49697, составные части: проезды, площадки, подкран. путь, дорожки, подпор. стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница), склад (2328,4 кв. м, 500/С-53297), склады (895,5 кв. м, 500/С-53808), склады, гаражи (53,6 кв. м, 500/С-53897), склады, администрат. помещения, агрегатные (563,7 кв. м, 500/С-53846), инженерный корпус (3348,6 кв. м, 500/С-46093), административно-производ. корпус № 4 (19710,5 кв. м, 500/С-53638), склад (2193,5 кв. м, 500/D-708019487), строительный цех (507,9 кв. м, 500/С-53845), насосная станция автоматич. пожаротушения (194,4 кв. м, 500/С-54016), станция очистки сточных вод (305,1 кв. м, 500/С-54015), градирня (39,1 кв. м, 500/С-55130), ливневая канализац. сеть (1077,5 м, 500/С-1029279), хозяйственно-питьевая водопров. сеть (973,2 м, 500/С-1029266), хозяйственно-бытовая канализац. сеть (764,5 м, 500/С-1029275), тепловая сеть (236,7 м, 500/С-1029272). Иное имущество, входящее в состав лота: внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), кабельные телеф. сети (инв. № 12030041), оборудование РП-2 (инв. № 13041207, инв. № 13041173), конденсат. установки (инв. №№ 13040254, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), ТП (инв. №№ 13040099, 13040120), пульт распределит. (инв. № 13040780), комплекты ТП (инв. №№ 13040082, 13040076, 13040053, 13040030), комплект. распред устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты груз. (инв. №№ 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопас. (инв. № 28240071), объекты растительности (деревья 10 шт., газоны 10 шт.) | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га) | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 14 907 600,31 бел. руб.** (снижена на 50 %) | |
| **Лот № 3** | |
| **Производственная база** в составе: заводоуправление (2763,5 кв. м, 500/С-53298, составные части: проезд, дорожка, площадки, ограждение, бордюры), производ. корпус (13365,7 кв. м, 500/С-45217), технологич. котельная (200,30 кв. м, 500/С-53824), тепловая сеть (43,8 м, 500/С-1029271), ливневая канализац. сеть (547,1 м, 500/С-1029280), хозяйственно-бытовая канализац. сеть (161,3 и 169 м, 500/С-1029273, 500/С-1029277), хозяйственно-питьевая водопров. сеть (68,4 и 295,1 м, 500/С-1029269, 500/С-1029267).<br>Иное имущество, входящее в состав лота: внутриплощад. каб. сети (инв. № 12020084), каб. телеф. сети (инв. № 12030035), комплект. ТП (инв. № 13040065), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040194), конденсат. установки (инв. №№ 13040294, 13040283, 13040171), низковольт. конденсат. установка (инв. № 13040202), объекты растительности (деревья 13 шт., газоны 2 шт.) | |
| ***Сведения о земельных участках,*** предоставленных продавцу для размещения объектов иного назначения:<br>1) на праве временного пользования пл. **1,94 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на зем. участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зоне линий связи и радиофикации (пл. 0,0268 га), в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0339 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4485 га), канализации (пл. 0,1234 га), теплоснабжения (пл. 0,0322 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0975 га), недвиж. матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,3730 га);<br>2) на праве долевой аренды (срок действия по 31.03.2026) для размещения технологич. котельной пл. **0,0991 га** с ограничениями | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 18 619 054,40 бел. руб.** | |
| **Обременения:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания с инвентарн. номерами 500/С-53224 (лот № 1), 500/С-46093 (лот № 1), 500/С-53298 (лот № 3) находятся в залоге у банков. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.<br>В соответствии с градостроит. проектом детального планирования, на зем. участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекат., выставочно-музейного, музейно-просветит. назначения, многоуровневой автостоянки.<br>На территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота | |
| **Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 13.03.2021 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **26.04.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.04.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |

